

ЯКІЯ ВЫРАБЫ ПРАДСТАВІЛІ ПРЭЗІДЭНТУ **2**

ЯКІМ БУДЗЕ ВІРУС ГРЫПУ СЁЛЕТА **7**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ВЕРАСНЯ 2018 г. СЕРАДА № 180 (28796)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Беларусь падзяляе меркаванне пра тое, што ў агляднай перспектыве ядзерная энергетыка будзе захоўваць свае пазіцыі і патэнцыял для развіцця. Беларускі бок вітае крокі, што прымаюцца МАГАТЭ, накіраваныя на садзейнічанне дзяржавам-членам у стварэнні і развіцці ядзернай энергетычнай інфраструктуры. Узаемадзеянне Беларусі і МАГАТЭ па гэтым пытанні разгарнулася з першых дзён рэалізацыі нашай нацыянальнай ядзернай энергетычнай праграмы. Наша краіна актыўна выкарыстоўвае ўвесь спектр інструментаў агенцтва — ад праектаў тэхнічнага супрацоўніцтва да экспертных місій і партнёрскіх разглядаў».*

# ГЕРОЮ АД ЗЕМЛЯКОЎ



У вёсцы Гарадзілавічы Верхнядзвінскага раёна ідзе рэканструкцыя помніка Герою Савецкага Саюза Івану Макіёнку — ураджэнцу гэтых мясцін, аўтаматчыку марской пяхоты Чарнаморскага флоту, які абараняў Адэсу і Севастопаль, па-геройску загінуў у сакавіку 1944 года пры вызваленні порта ва ўкраінскім Мікалаеве.

Аднаўленчыя работы мемарыяла вядзе брыгада будаўнікоў прадпрыемства «Інтэрсэрвіс» з Наваполацка. Спецыялісты-ўніверсалы ўжо займаліся рэканструкцыяй помнікаў Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку і спаленым вёскам былога Асвейскага раёна. На гэтым фота Андрэй БАЛАЙ, Віктар БУЧКІН, Вадзім АЛЬШЭЎСКІ і Аляксандр КАДЛУБОВІЧ вядуць мантаж пастаментаў пад мармуровую стэлу і сапраўдны марскі якар.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

## КОРАТКА

- **Мінсельгасхарч і Рассельгаснагляд правядуць 19—20 верасня ў Смаленску нараду па пастаўках малака.**
- АНТ рыхтуе маштабны дакументальны фільм пра Белавежскую пушчу.
- **Праект рашэння Магілёўскага аблвыканкама аб абмежаванні продажу алкаголю ў Быхаўскім раёне ўначы вынесены на грамадскае абмеркаванне.**



- 14-гадовая дзяўчынка з Заслаўя, якая знікла адтуль 15 верасня, была знойдзена ўчора ў раёне сталічнага чыгуначнага вакзала.

■ Культурны асяродак

# МУЗЫЧНАЯ АРЫФМЕТЫКА ІВАНА КІРЧУКА



Публіка прызвычаілася бачыць Івана КІРЧУКА — музычнага вешчуна і магістра рытуалаў. Але шматгранны музыка можа ўзяць у рукі і звычайны гармонік ды завесці прыпеўкі.

**Гэта адзін з тых музыкаў, пра якіх думаеш — яны былі заўжды. Насамрэч нястомны збіральнік, захавальнік і выканаўца беларускага музычнага фальклору, лідар этна-трыа «Троіца», выкладчык і батлеечнік Іван Кірчук толькі на мінулым тыдні адзначыў 60-годдзе. Зрэшты, у прыхільнікаў творчасці яшчэ будзе магчымасць павіншаваць яго — падчас прэзентацыі новага альбома «Цар агонь» 27 верасня ў Белдзяржфілармоніі. А пакуль што мы з Іванам Іванавічам сядзім у ягонай этналабараторыі, разглядаем старыя здымкі і ўнікальную калекцыю музычных інструментаў з усяго свету ды разважаем пра жыццёвыя высновы, творчыя планы і сэнс розных лічбаў у лёсе «Троіцы».**

СТАР. 5

■ Датычыцца кожнага

# І ЗНОЎ АБ АДЗІНОЦЕ...

### Іншым разам яна можа праяўляцца самым дзіўным чынам

**Адзінота і асаблівая адзінота ў сям'і — рэальная прыкмета нашага часу, і асабліва балюча яна б'е па пажылых людзях. Так, ёсць дзеці і жывыя сваякі. Але яны занадта занятыя сваімі справамі... «Што б я ні сказала, што б ні прапанавала, усё будзе не так. Яны жывуць па-іншаму, і ў мяне няма права голасу...», — паскардзілася неяк наша пажылая чытачка. «Мае дзеці і ўнукі жывуць, уткнуўшыся ў свае тэлефоны», — горка сказала яшчэ адна...**

### «Жыць у турме мне падабаецца больш»...

Часам справа даходзіць да зусім дзікіх рэчаў. Напрыклад, у Японіі, каб пазбавіцца ад адзіноты, некаторыя пажылыя людзі садзяцца ў турмы. Па статыстыцы, кожная пятая зняволеная японка — пенсійнага ўзросту, звычайна 9 з 10 пажылых жанчын асуджаны за дробныя крадзяжы. Такім чынам бабулі пазбаўляюцца ад адзіноты, ахвяруючы сваёй свабодай. Думаеце, гэта толькі ў Японіі так, а ў нас адзінокіх людзей няма?

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ТЭРЫТОРЫІ АДКАЗНАСЦІ

## Для былога міністра прамысловасці адной з іх стала Орша

**Пра гэта стала вядома па выніках нарады, на якой Аляксандр Лукашэнка разглядзеў кадравыя пытанні.**

Так, Віталь Воўк, які са снежня 2014 года да 15 жніўня 2018-га працаваў на пасадзе міністра прамысловасці, быў прызначаны памочнікам Прэзідэнта Беларусі — інспектарам па Віцебскай вобласці.

«Віталь, што датычыцца цябе, дык тут размоў будзе куча, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Адны будуць радавацца, іншыя будуць шкадаваць. У нас жа нямала людзей, якія так рукі паціраюць — вось, чыноўніку галаву б «адсекчы», «павесіць» кагосьці і так далей. Розныя будуць пазіцыі і пункты гледжання».

Беларускі лідар падкрэсліў, што Орша застаецца за Віталем Воўкам, гэта яго зона адказнасці. «На гэтай пасадзе ў цябе ёсць магчымасць многія пытанні ўзяць на кантроль, падказаць і арганізаваць, як іх вырашыць, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае, каб вопыт быў перанесены туды».

На думку Прэзідэнта, у Віцебскай вобласці першапачаткова некаторыя будуць разглядаць Віталя Воўка з такой пазіцыі, маўляў, раней ён быў міністрам, а цяпер стаў памочнікам, хоць — на што кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу — гэта пазіцыі роўныя, а інспектар нават вышэй, чым міністр.

Лукашэнка запатрабаваў, каб Віталь Воўк «жалезабетонна праводзіў у Віцебскай вобласці лінію Прэзідэнта», выконваў свае абавязкі, у прыватнасці, трымаў на кантролі кадравую сітуацыю. Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што для такога вопытнага чалавека гэта не складаная работа.

На яго думку, усе недахопы і няўдачы Віталя Воўка — аб'ектыўныя і ад яго ў нейкай ступені не залежалі. «Думаю, табе гэта быў урок і на новай пасадзе ты карысць для краіны прынясеш», — дадаў Прэзідэнт.

### З ВІДАМ НА БАЛТЫКУ

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы прызначыў начальніка галоўнага кадравага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Васіля Марковіча на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Латвіі.

Латвія — гэта краіна, з якой у Беларусі нядрэнныя адносіны, «у адрозненне ад літоўскіх суседзяў яны разумеюць, што з Беларуссю трэба не проста мірна жыць, трэба супрацоўнічаць, бо занадта шмат што нас звязвае», адзначыў Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, у Латвіі неабходны чалавек гаспадарскі. «Пасол, якога вы рэкамендуеце, справіцца з гэтымі функцыямі і абавязкамі?» — спытаў беларускі лідар у міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства запэўніў, што Марковіч — жорсткі, прынцыповы і валявы кіраўнік, які абавязкова справіцца з пастаўленымі задачамі.

Акрамя таго, Уладзімір Макей адзначыў, што цяпер у Беларусі з Латвіяй складваецца нармальны і палітычны, і гандлёва-эканамічны дыялог, ідзе рост тавараразвароту і беларускага экспарту — нават без уліку нафтапрадуктаў і ўгнаенняў. Але магчымы максімум яшчэ дакладна не дасягнуты. Перспектыўныя сферы супрацоўніцтва — партовая інфраструктура, інвестыцыі, сфера высокіх тэхналогій. «Вельмі важны палітычны дыялог. Ёсць запрашэнне вам, дачакаемся выбараў сёлета ў кастрычніку ў Латвіі і ў першай палове наступнага года будзем рыхтаваць рэзультатыўны візіт кіраўніка дзяржавы», — адзначыў Уладзімір Макей.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што выхаду да мора ў Беларусі няма, таму ў выпадку адсутнасці зацікаўленасці ў супрацоўніцтве з боку Літвы ўпор у гэтым плане трэба зрабіць на Латвію.

Яшчэ адна перастаноўка: намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення еўразійскай інтэграцыі галоўнага ўпраўлення Расіі, краін СНД і еўразійскай інтэграцыі МЗС Аляксей Самасуеў стаў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Фінляндыі і па сумяшчальніцтве ў Даніі.

Што датычыцца Фінляндыі, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў: тут пазіцыі Беларусі не самыя лепшыя, хоць краіна вельмі цікавая для нашай дзяржавы, ёсць абсалютна падобныя кірункі ў эканоміцы, асабліва дрэваапрацоўка. «Нам трэба працаваць у гэтым кірунку, каб вопыт Фінляндыі ў найлепшых сектарах эканомікі прыўнесці на тэрыторыю Беларусі», — падкрэсліў беларускі лідар.

### «АРШАНСКІ ТРЭНД»

На іншай нарадзе Прэзідэнт узгадніў прызначэнне трох новых мясцовых кіраўнікоў: па-першае, дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства філіяла «Невель» ААТ «Пінскі мясакамбінат» Ігар Брылевіч быў узгоднены на пасаду старшыні Пінскага райвыканкама, паколькі цяперашні старшыня Валерый Рабкавец быў рэкамендаваны на пасаду першага намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама.

У гутарцы з Ігарам Брылевічам Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся станам спраў сельскагаспадарчага прадпрыемства філіяла «Невель» ААТ «Пінскі мясакамбінат» і сітуацыяй з гаспадаркамі на Піншчыне ў цэлым. Ігар Брылевіч праінфармаваў Прэзідэнта, што раней было 24 гаспадаркі, у выніку розных працэдур іх стала 19, на што кіраўнік дзяржавы заўважыў, каб не было штучнага аб'яднання, а ўсе дзеянні былі ўсвядомленыя. Чыноўнік адзначыў, што ўсе рашэнні па аб'яднанні прымаліся ўзважана і разумна, каб даць развіццё прадпрыемствам, а таксама захаваць працоўныя калектывы.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: Пінск — гэта не Орша, аднак трэнд апошняй трэба ўлічваць. Паводле яго слоў, сярэднія гарады Беларусі трэба ажывіць, калі гэта неабходна, падняць на больш высокі ўзровень, але галоўнае — гэта вытворчасць, каб было, дзе працаваць людзям і атрымліваць заработную плату. Па словах Прэзідэнта, Пінск — гэта паўднёвы аплот, таксама ён анансаваў свой візіт у гэты горад у наступным годзе.

### УВАГА КОЖНАМУ КАВАЛАЧКУ

Таксама Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў намесніка старшыні Мёрскага райвыканкама Аляксандра Баданіна на пасаду старшыні Браслаўскага райвыканкама, а першага намесніка старшыні, начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Лепельскага райвыканкама Міхаіла Кісялевіча — на пасаду старшыні Лепельскага райвыканкама.

У размове з Аляксандрам Баданіным кіраўнік дзяржавы папрасіў звярнуць увагу на тое, каб кожны кавалачак зямлі ў Браслаўскім раёне працаваў. «Браслаўскаму, Мёрскаму раёнам да Пінска далёка, але ў іх свае прыгажосці ёсць, на чым можна зарабляць грошы. Таму паглядзіце на гэты раён уважліва. Яго трэба падымаць. Гэта жамчужына нашай Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца Лепельскага раёна, то Прэзідэнт адзначыў, што ў ім неабходна дакладна выбудаваць праграму дзеянняў. «Мы зараз сур'ёзна ўзяліся за Віцебскую вобласць, асабліва ў сельскай гаспадарцы. Прыкладна ўжо разумеем, што рабіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### ШЭСЦЬ КАДРАЎ

У рабочым парадку Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў і іншыя кадравыя перастаноўкі. Так, намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю быў прызначаны Васіль Герасімаў.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Нігерыі і па сумяшчальніцтве ў Гане і Камеруне Вячаслаў Брыль быў прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Кот-д'Івуары па сумяшчальніцтве.

Намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама стаў Барыс Яфрэмаў. Іван Маркевіч быў узгоднены беларускім лідарам на пасаду намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама.

Алег Сталярчук быў узгоднены на пасаду члена Віцебскага аблвыканкама, а Дзмітрый Рэуцкі — на пасаду члена Мінскага аблвыканкама і Мінскага гарвыканкама.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ЦАЛКАМ БЕЛАРУСКАЕ!

## Айчынныя прадпрыемствы прадставілі Прэзідэнту навінкі вытворчасці

**Снегаўборачныя і лёдазалівачныя машыны, спартыўнае абсталяванне і музычныя інструменты прэзентаваны на адмысловай выстаўцы. Адна з асноўных задач для ўсіх вытворцаў-удзельнікаў — імпартазамяшчэнне.**


Фота БелТА.

Адкрывалі экспазіцыю снегаўборачныя і лёдазалівачныя машыны, ратракі (транспартны сродак для падрыхтоўкі лыжных трас), створаныя на базе трактароў МТЗ, і энергагенератары ААТ «МІСОМ». «Цалкам беларуская» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка ў дачыненні да тэхнікі.

— Да наступнай зімы павінен быць чыста беларускі ратрак, гэта не праблема. Самае складанае ў вас ёсць: энергетычны сродак, кабіна, кіраванне. А ўсё астатняе — элементарна. Сёлета вы забяспечваеце неабходны аб'ём, які патрэбны біятланістам, лыжнікам, з таго, што ёсць. У наступным годзе гэта тэхніка павінна быць выключна беларускай, — адзначыў Прэзідэнт.

У зале выставачнага комплексу «БелЭкспа», які ў народзе з-за сваёй формы атрымаў назву «Рамонак», прадстаўлена абсталяванне для заняткаў спортам і культурнага адпачынку.

Спартыўны інвентар створаны ў асноўным для дзіцячых спартыўных школ, устаноў адукацыі і аматараў — на званне распрацоўка для прафесіяналаў не прэтэндуюць.

Прадпрыемства «Марка» прадставіла Аляксандру Лукашэнку свае лыжныя чаравікі для язды класічным і каньковым ходам. Больш за 3600 пар такога абутку паставяць у спартыўныя школы ў якасці спонсарскай дапамогі.

Асвоена вытворчасць і мацавання для лыжаў. Па якасці не саступаюць замежным канкурэнтам, а ў цане і выйграюць.

— Тое, што зрабілі гэтыя мацаванні, малайцы. Толькі не спыняйцеся. Удасканальвайце і абыходзьце гэтыя заходнія кампаніі. Зрабіце лепш, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паказалі Прэзідэнту таксама лыжныя палкі, мазі і айчынныя лыжаролеры. У вытворчасці лыжаў пакуль не ўсё дасканала. Айчынныя прадпрыемствы ў гэтым кірунку плануюць супрацоўнічаць з замежнымі кампаніямі.

Далей размясцілася экспазіцыя музычных інструментаў: піяніна, гітары, баяны, гармонікі, цымбалы, домры, балалайкі, дуда.

Справа па вырабе інструментаў досыць тонкая і патрабуе ручной працы, таму аб'ёмы майстэрняў невялікія. Звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, што неабходна не толькі ствараць новыя, але і аднаўляць старыя інструменты.

Самі музыканты таксама сцвярджаюць, што некаторыя інструменты могуць «раскрыцца» толькі праз гады.

Першую скрыпку ў вытворчасці гэтага інструмента ў Беларусі зайграў майстар Аляксандр Сурба. Сярод лідараў у вытворчасці домраў і балалаек пінчук Руслан Макарэвіч. Яму Прэзідэнт даручыў захаваць школу па стварэнні гэтых інструментаў:

— Прыцягвай да работы столькі чалавек, колькі трэба. Таму што гэты інструмент трэба будзе яшчэ адрамантаваць, мабыць. За табой — школа. Пакуль ты адзін, але ў цябе павінна быць больш памочнікаў.

Вытворцы баянаў і гармонікаў з Маладзечна прэзентавалі сваю навінку — бесконтактавую медыясістэму. Яна ўяўляе сабой баян, які з дапамогай Wi-Fi перадае гук на калонкі і можа імітаваць разнастайныя інструменты. Створана пакуль толькі чатыры такія баяны-аркестры.

Прэзідэнт даручыў дапамагчы і вытворцам гітар і цымбалаў: «Трэба зрабіць так, каб годная ў іх была вытворчасць, каб не сорамна было».

Аляксандр Лукашэнка ацаніў якасці і айчыннага піяніна, якое пакуль складаецца з імпартных дэталяў.

— Палічыце, колькі трэба грошай на ўсё, пра што мы гаварылі, без празмернасцяў. Да 1 кастрычніка скажыце. Асноўнае мы павінны вырабіць у сябе. Што трэба па імпарце пакуль закупіць — мы закупім. Але мы сабраліся для таго, каб выраблялі ўсё ў сябе. І дадаткова тыя інструменты, якія тут не прадстаўлены. Гэтая праграма павінна быць рэалізавана адсоткаў на 90—95 ужо ў 2019 годзе, — падвёў вынікі сустрэчы Прэзідэнт.

Грошы на годную справу абавязкова будуць, бо ўсё гэта робіцца для дзяцей. А здаровая, спартыўная, таленавітая і ўсебакова развітая моладзь — гарант шчаслівай будучыні нашай краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Андрэй КІБІНЬ, уладальнік майстэрні па вытворчасці гітар (горад Гродна):**

— Я адзіны ў Беларусі вытворца гітар. Купляюць іх у асноўным беларускія музыканты. Прыкладны кошт адной — ад 1000 беларускіх рублёў. У год ствараем ад 50 да 60 гэтых музычных інструментаў. Вытворчасць гітар — гэта ручная праца. Над адной працуюць два-тры месяцы. Маё прадпрыемства невялікае — толькі тры майстры. Супрацоўнікі паступова пераймалі мой вопыт. Цяжка сказаць, чым мой інструмент адрозніваецца ад замежных, — гэта вельмі тонкая рэч. Але я лічу свае гітары лепшымі.

**Юрый ЦІМОХАЎ, галоўны інжынер прадпрыемства па прататыпаванні (горад Смалявічы):**

— На выстаўцы мы прадстаўляем лыжаролеры айчыннай вытворчасці. Мы першыя, хто ў Беларусі пачаў іх выпускаць. Нам была пастаўлена задача падрыхтаваць лыжаролеры для дзіцяча-юнацкіх школ і аматараў. Яны павінны быць надзейнымі і ў цэнавым дыяпазоне даступнымі для спажыўцоў па максімуме, камплектуючыя павінны быць ад беларускага вытворцы. І мы да гэтага падышлі. Лыжы на 90 % нашы беларускія — калёсы Белшыны, рамы вырабляюць у Слуцку, восевая частка з Оршы. Лыжы мы ствараем для біятланістаў-аматараў, не прафесіяналаў. Мы справіліся за чатыры месяцы. Лыжы апрабаваны біятланістамі. Цяпер абсталяванне паступае ў школы, адмоўных водгукаў пакуль не было. Такая пара лыжаў каштуе 245 беларускіх рублёў. Калі параўноўваць з замежнымі аналагамі, то іх кошт пачынаецца ад 300 рублёў.

■ Факт

# У цэнтры ўвагі — моладзь

**У Беларусі будзе створаны міжведамасны савет па развіцці дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. У яго ўвойдуць прадстаўнікі дзяржаўных органаў кіравання і грамадскіх аб'яднанняў.**

Як растлумачыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Тацццяна СІМАНОЎСКАЯ,** Савет ствараецца з мэтай аператыўнага вырашэння розных праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у маладзёжным асяроддзі: ва ўсіх зацікаўленых бакоў будзе магчымасць сабрацца за круглым сталом, каб абмеркаваць праблему і выпрацаваць сумеснае рашэнне.

Акрамя гэтага, распачалася работа над распрацоўкай Стратэгіі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі да 2030 года. «Гэта будзе новы дакумент, дзе знойдуць адлюстраванне ўсе асноўныя кірункі маладзёжнай палітыкі, будуць сфармуляваныя задачы на будучыню. У рабочую групу па яго стварэнні ўвойдуць прадстаўнікі моладзі, вопытныя даследчыкі, аналітыкі, спецыялісты з розных сфер дзейнасці: эканомікі, сацыяльнай сферы, адукацыі, навукі», — растлумачыла Тацццяна Сіманоўская.

Сёння моладзь займае 18 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва краіны (каля 2 мільёнаў чалавек). Як сведчаць сацыялагічныя апытанні, на першым месцы ў каштоўнасных прыярытэтах у маладых людзей стаяць якасная адукацыя і сям'я. Хвалюююць моладзь таксама пытанні прафесійнай занятасці і самарэалізацыі.

Між іншым, у лістападзе ў краіне пройдзе першы нацыянальны форум студэнцкай моладзі.

На базе Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра ўжо створаны маладзёжны партал moladz.by. Зараз вядзецца работа па яго напаўненні. Інфармацыя, якая датычыцца дзейнасці ўсіх маладзёжных арганізацый у краіне (БРСМ, Лігі добраахвотнай працы моладзі, Беларускай лігі інтэлектуальных камандаў, Беларускага КВЗ, Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА, Беларускай рэспубліканскай скаўцкай арганізацыі і іншых), будзе акумулявацца менавіта на гэтым партале.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Наш Парыж у мастацтве

**Заўтра ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрыецца выстаўка «Майстры Манпарнаса з беларускіх мястэчак». Экспазіцыя прадстаўляе прыватныя калекцыі, у якіх захоўваюцца творы сусветна вядомых беларускіх мастакоў Парыжскай школы: Марка Шагала, Шрага Царфіна, Восіпа Любіча, Восіпа Цадкіна, Раберта Геніна, Яўгена Зака, Міхаіла Кікоіна і Пінхуса Крэменя. Некаторыя работы дэманструюцца ўпершыню ў публічным доступе.**


Карціна Шрага Царфіна.

Да творчасці майстроў Манпарнаса пачатку і сярэдзіны ХХ стагоддзя калекцыянеры выяўляюць сталую зацікаўленасць на працягу 100 гадоў, пачынаючы ад канца Першай сусветнай вайны. У гэты час іх творы ў Парыжы пачалі набываць «маршаны», якія адыгрывалі заўважную ролю на «рынку мастацтва» у пачатку ХХ стагоддзя і дзякуючы каторым у тыя гады сталі вядомымі імёны многіх цяпер знакамітых мастакоў. Творчасць майстроў Парыжскай школы, яднаючы краіны і народы, іх мастацкія традыцыі, наглядна сведчаць пра значнасць месца, якое займае наша краіна ў агульнаеўрапейскай культуры. У экспазіцыі глядач убачыць 100 твораў розных жанраў, якія датуюцца часам ад 1915-га да 70-х гадоў мінулага стагоддзя і якія выкананы ў розных тэхніках жывапісу і графікі. Для больш глыбокага разумення экспазіцыі наведвальнікам прапанавана ўнікальная адукацыйная праграма з лекцый беларускіх і замежных спецыялістаў — даследчыкаў Парыжскай школы, а таксама цыкл дакументальных фільмаў пра мастакоў.

Работы, што прадстаўлены на выстаўцы, дапамогуць больш поўна зразумець стаўленне мастакоў да жыцця і смерці, іх уяўленне пра шчасце, каханне, журбу і радасць Чалавека. Наведвальнікам будзе прадстаўлены шырокі дыяпазон кірункаў класічнага мадэрнізму ХХ стагоддзя: фавізм, кубізм, экспрэсіянізм. Факт вяртання творчасці мастакоў Парыжскай школы на радзіму працягваецца дзякуючы цікавасці да іх работ з боку калекцыянераў. Творы з прыватных збораў, якія прадстаўлены на выстаўцы ў Нацыянальным гістарычным музеі, служаць яшчэ адным пацвярджэннем таго, што нашы суайчыннікі не заставаліся ўбаку ад працэсу развіцця сусветнай культуры, а часам рабілі на яго самы непасрэдны ўплыў.

**Варвара ГОМАН**

■

# У гонар Афанасія Брэсцкага

**Роўна 370 гадоў таму загінуў Афанасій, ігумен Брэсцкі, абараняючы праваслаўную веру.**

Кожны год 18 верасня царква адзначае яго пакутніцкую смерць хрэсным ходам. Сёлета хрэсны ход ад Свята-Сімяонаўскага кафедральнага сабора ў Свята-Афанасьеўскі мужчынскі манастыр сабраў сотні вернікаў. Боскую літургію і святочны малебен узначаліў прадстаяцель Беларускай праваслаўнай царквы, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. У другой палове дня ў парку 1000-годдзя Брэста ў мікраёне Вулька адбылася закладка памятнай алеі дрэў, прысвечанай успаміну пра 370-годдзе пакутніцкай смерці святога Афанасія. У лістападзе ў Брэсце запланавана навукова-багаслоўская канферэнцыя, прысвечаная Афанасію, ігумену Брэсцкаму. Да ўдзелу запрошаны вучоныя свецкіх і духоўных навучальных устаноў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

# Восы напалі на дзяцей

**Чарговае паведамленне, звязанае з гэтымі насякомымі: у Слуцку яны атакавалі дзяцей у двары дома.**

Здарэнне адбылося па вуліцы 14 Партызан. Відавочцы кажуць, што восы напалі на малых, якія гулялі ў двары дома. Агрэсію насякомыя праявілі, калі дзеці паспрабавалі дастаць мяч, які ўпаў у драўляны калодзеж. На месца з мэтай ліквідацыі асінага гнязда выязджалі работнікі МНС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Чулі?!

# ПАЗНАЁМІМСЯ З... ТАРАМАТАМ

**Спецыяльнае прыстасаванне для аўтаматычнага прыёму тары (тарамат) прэзентуюць у Мінску ў Дзень без аўтамабіля, 22 верасня, паведамілі БелТА ў гарадскім камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**



Такія тараматы працуюць у суседняй Літве.

Абсталяванне будзе ўстаноўлена на вул. Леніна, дзе пройдзе маштабнае экалагічнае свята. Тарамат прымае пластыкавыя і шкляныя бутэлькі, бляшанкі з-пад напояў. Азнаёміцца з яго работай зможа кожны. Акрамя таго, з 15.00 да 19.00 кожную гадзіну сярод наведвальнікаў разыграюць каштоўныя прызы.

Як паведамлялася, у краіне пачалася распрацоўка механізму функцыянавання дэпазітна-закладной сістэмы звароту тары. Новаўвядзенне заснавана на эканамічным стымуляванні спажыўца вярнуць выкарыстаную ўпакоўку. Купляючы тавар ва ўпакоўцы, спажывец выплачвае за яе залог, а пры вяртанні пустой упакоўкі ў тараматы сума гэтага закладу яму вяртаецца. Мяркуецца, што за кошт гэтага механізму ў паўторную перапрацоўку будзе вяртацца да 80—90 % выкарыстанай упакоўкі.

Дэпазітна-закладная сістэма паспяхова функцыянуе ў многіх еўрапейскіх краінах.

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Расія: дзеянні ў адказ будуць



Расійскі самалёт Іл-20 быў збіты з комплексу С-200 сіл СПА Сірыі над Міжземным морам з той прычыны, што за ім хаваліся знішчальнікі F-16 Ізраіля. На борце знаходзіліся 15 ваенных, усе яны загінулі, паведаміў афіцыйны прадстаўнік Мінабароны Расійскай Федэрацыі Ігар Канашэнкаў.

У Маскве падкрэслілі, што Іл-20 збілі з-за дзеянняў Ізраіля: пра запланаваны ракетны абстрэл Ізраіль папярэдзіў расійскі бок за хвіліну да ўдару, з-за чаго Іл-20 не паспелі вывесці ў бяспечную зону.

У Мінабароны РФ адзначылі, што разглядаюць дзеянні Ізраіля як варожыя, а таксама заявілі аб праве на «адэкватныя дзеянні», паведамляе РБК.

«Ізраільскія сродкі кіравання авіяцыяй і лётчыкі F-16 не маглі не бачыць расійскі самалёт, бо ён заходзіў на пасадку з вышыні 5 км. Тым не менш яны наўмысна пайшлі на гэтую правакацыю», — паведаміў на брыфінгу генерал-маёр Ігар Канашэнкаў. Ён таксама дадаў, што такія дзеянні «абсалютна не адпавядаюць духу расійска-ізраільскага партнёрства».

Расійскі ваенны самалёт Іл-20 знік вечарам 17 верасня каля 23.00 (па мінскім часе) падчас атакі ізраільскіх ВПС на сірыйскія аб'екты ў правінцыі Латакія. Суразмоўнік CNN сярод амерыканскіх афіцыйных асоб са спасылкай на свае даныя паведаміў, што расійскі Іл-20 быў збіты сірыйскімі сіламі СПА. Паводле яго слоў, апошнія спрабавалі спыніць атаку ізраільскай авіяцыі на правінцыю Латакія і выпадкова трапілі ў расійскі самалёт.

## Ілан Маск прадставіў першага турыста для палёту вакол Месяца

Кіраўнік SpaceX Ілан Маск прадставіў першага турыста, які адправіцца ў касмічны палёт вакол Месяца. Ім стане японскі мільярдэр Юсаку Маэдзава. Сам Маэдзава адмовіўся назваць цану за гэтае падарожжа, аднак сказаў, што зрабіў перадаплату. Па словах Ілана Маска, сума «значная», і яна акажа ўплыў на распрацоўку ракеты BFR (Big Falcon Rocket).

У Twitter кампаніі адзначаецца, што падарожжа зойме каля тыдня. Ракета з турыстам праляціць на адлегласці каля 200 км ад Месяца.

Кампанія SpaceX абвясціла аб выбары чалавека, які першым у гісторыі адправіцца ў якасці турыста вакол Месяца, 14 верасня. Як мяркуюць у кампаніі, гэта падзея стане важным крокам на шляху да таго, каб звычайныя людзі атрымалі магчымасць падарожнічаць у космасе.



SpaceX дадала, што толькі 24 чалавекі за ўсю гісторыю пабывалі на Месяцы, а пасля амерыканскай місіі «Апалон» у 1972 годзе больш ніхто з людзей не быў там. Кампанія паведаміла аб планах арганізаваць камерцыйны палёт вакол Месяца ў пачатку 2017 года.

Па даных Forbes, багацце Юсаку Маэдзава складае 2,9 млрд долараў. Ён заснаваў найбуйнейшы японскі анлайн-магазін адзення Zozotown.

## СМІ: ЗША рухаюцца ў напрамку поўнамаштабнай эканамічнай вайны з Расіяй

Указ прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, які прадугледжвае прымяненне аднабаковых санкцый у адносінах да замежных арганізацый і асоб за ўмяшальніцтва ў ход выбараў у ЗША, сведчыць аб рэзкім узмацненні жорсткасці палітыкі ў дачыненні да Расіі. На гэта ўказаў часопіс Newsweek, назваўшы падпісанне ў мінулую сераду гэтага ўказа «рашучай перамогай тых у адміністрацыі, хто прытрымліваецца жорсткай пазіцыі ў дачыненні да Расіі».

«Замест перазагрузкі адносін, якую Трамп абяцаў [на расійска-амерыканскай сустрэчы 16 ліпеня] у Хельсінкі, ЗША рухаюцца ў напрамку поўнамаштабнай эканамічнай вайны з Расіяй», — піша часопіс, нагадваючы пра тое, што ЗША з 2014 года неаднаразова аб'яўлялі аб увядзенні антырасійскіх мер. «Ні адна з гэтых мер не нанесла шкоды папулярнасці прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і не прывяла да змены наступальнай палітыкі Расіі ў Сірыі, ва Украіне або ў дачыненні да апанентаў унутры краіны», — адзначаецца ў артыкуле.

# У Оршы на старым складзе выявілі ртуць

**Пра гэта ратавальнікам паведаміў кіраўнік прадпрыемства. Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, на складзе быў разліты вадкі метал з ртутных выпрамнікоў (лямпаў), што былі разбітыя. Памяшканне знаходзілася на першым паверсе будынка, які рыхтуецца пад знос.**

Лямпы з выпрамнікамі выявілі рабочыя, калі разбіралі склад. Усяго на ім захоўваліся 84 лямпы ў драўляных скрынях. Па інфармацыі МНС, пры аглядзе было ўстаноўлена, што некалькі скрынь і лямпаў у іх пашкоджаны. Работнікі аддзялення хімічнай і радыяцыйнай абароны МНС правялі механічны збор ртуці ў колькасці 3950 грамаў, ускрыццё і абследаванне скрынь, дэмеркурызацыйныя работы. Вадкі метал і адходы былі герметычна спакаваныя для наступнай утылізацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Факт

## У гонар касманаўтаў

**Мінулы тыдзень у Мінску азначыўся правядзеннем 31-га Міжнароднага кангрэса Асацыяцыі касмічных палётаў.**

Да гэтай падзеі была прымеркавана і прэзентацыя аднайменнага паштовага праекта. Ён складаецца з мастацкай паштовай маркі, канверта Першага дня, спецыяльнага памятнага штэмпеля і мастацкай немаркіраванай карткі. Марка адрукавана тыражом у 48 тысяч экзэмпляраў. Яе мастацкай асновай стаў лагатып міжнароднага кангрэса.

Форумы такога маштабу праводзяцца толькі ў тых краінах, дзе выраслі касманаўты. З Беларусі за межы зямной атмасферы адпраўляліся трое: Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак і Алег Навіцкі.

## Памяці Ізраіля Басава

**100 гадоў таму ў горадзе Мсціславе нарадзіўся славуты мастак Ізраіль Басаў. Ён стварыў свой выразны і пазнавальны стыль. Мастацтвазнаўцы лічаць, што ён ажыццявіў вяртанне да традыцый еўрапейскага мадэрнізму.**



З сярэдзіны 1970-х творчасць Ізраіля Басава была недаступнай для шырокай публікі з-за негатыўнага стаўлення арганізатараў выставак. Сапраўдны рэнесанс адбыўся ў пачатку 90-х гадоў, калі палотны мастака патрапілі на выстаўкі андэграўнду спачатку ў Мінску, а пасля ў Маскве і Іерусаліме.

Да юбілею мастака выпушчаны спецыяльны канверт з арыгінальнай маркай. На ёй намалявана аўтапартрэт Ізраіля Басава. Ілюструюць канверт карціны «Мінск. Поўдзень» і «Зялёны Мінск», створаныя ў 1960 і 1961 гадах.

Тыраж канверта складае 20 тысяч экзэмпляраў. Памятнае гашэнне адбудзецца 9 кастрычніка.

## Аляксандра-Неўскаму храму — 120!

**Гэты храм — помнік архітэктуры, які стаіць у Мінску на Вайсковых могілках, адметны тым, што захаваўся да нашых дзён практычна ў першапачатковым выглядзе, нягледзячы на войны і часы ваяўнічага атэізму.**

Да юбілею храма ў камернай зале Вялікага тэатра Беларусі адбылася прэзентацыя паштовага праекта, прымеркаванага да 120-годдзя Аляксандра-Неўскага храма ў Мінску. Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» падрыхтавалі да гэтай даты адмысловы паштовы праект, які складаецца з мастацкага маркіраванага канверта і спецыяльнага памятнага штэмпеля.

## Тарыфы крыху даражэюць

**З 15 верасня ў Беларусі змяніліся тарыфы на некаторыя паслугі па перасылцы міжнародных паштовых адпраўленняў.**

Так, каб паслаць простую паштоўку або ліст масай да 20 грамаў, цяпер трэба будзе даплаціць шэсць капеек. Пры гэтым расцэнкі на перасылку міжнародных адпраўленняў паскоранай пошты ў Аўстралію, Германію, Казахстан, Кітай, Літву, Польшчу, ЗША і Украіну застануцца нязменнымі. Ранейшы тарыф дзейнічае і на перасылку паштовых адпраўленняў унутры Беларусі ■

■ Конкурс

# Найлепшых прафесіяналаў вызначылі пад Мінскам

**На базу адпачынку «Дружба», што знаходзіцца паблізу Астрашыцкага Гарадка, на мінулым тыдні з'ехаліся некалькі дзясяткаў начальнікаў і намеснікаў начальнікаў аб'ектаў паштовай сувязі. На працягу трох дзён там праходзіў рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства. Знаўцы паштовай справы, якія паспяхова прайшлі адборачныя этапы спаборніцтва ў абласных філіялах, сабраліся там дваццаць другі раз. Сёлета конкурс быў прысвечаны Сусветнаму дню пошты і Году малой радзімы.**



Конкурс прафесійнага майстэрства — даўно ўсталяваная традыцыя РУП «Белпошта». Ён павышае прафесійны ўзровень паштовых супрацоўнікаў, якія дзеляцца сумеснымі напрацоўкамі, абменьваюцца назапашаным досведам, і ўмацоўвае карпарацыйны дух. Што і не дзіўна: беларуская пошта сёння — гэта шматтысячны калектыў высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія адданы сваёй прафесіі. Паміж мільёнамі кліентаў яна ва ўсе часы застаецца важным і надзейным звяном.



— Такая сістэма па павышэнні прафесійнага майстэрства, якая наладжана ў нашай арганізацыі, вельмі важная, — зазначыў у прывітальным слове **генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Уладзімір МАТУСЕВІЧ.** — Ад вашай працы, дакладнасці, прафесіяналізму, адказнасці, нераўнадушных адносін да людзей, якія даўно сталі візітоўкай Белпошты, залежыць далейшая перспектыва развіцця нашага прадпрыемства. Сённяшняя пошта — гэта комплексны цэнтр аказання насельніцтву не толькі паштовых, але і іншых найважнейшых сацыяльных паслуг — ад банкаўскіх і фінансавых да гандлёвых. Апошнім часам пачалося і развіццё дзяржаўных электронных паслуг. Пошта адыгрывае вельмі вялікую ролю і ў рэгіёнах дзякуючы забеспячэнню сацыяльна важнай прадукцыяй, застаючыся часам адзінай кропкай у населеным пункце, дзе гэтыя тавары можна набыць. Мы ідзём у нагу з сучаснымі тэхналогіямі. У найбліжэйшы час запусцім шэраг праектаў, дзякуючы якім кожны супрацоўнік, кіраўнік паштовага аддзялення адчуе на сабе, што праца стала крыху лягчэйшай, больш аператыўнай, што зробіць нас яшчэ больш запатрабаванымі. Але якія б сучасныя тэхналогіі і сэрвісы не прыходзілі б на нашу пошту, як і раней, ключавы фактар пры рабоце з кліентамі — гэта кваліфікаванае і хуткае абслугоўванне, а таксама ветлівыя адносіны.

Атмасфера духу спаборніцтваў вітала з самага пачатку конкурса. Каманды не толькі паказвалі творчы нумар, але адначасова прэзентавалі і фірменны касцюм. Затым канкурсанты сабраліся на праверку дамашняга задання «Інфармуй. Прапаноўвай. Прадавай». Паколькі пошта адносіцца да сферы паслуг, то адзін з ключавых момантаў — абслужыць кліента так, каб ён прыйшоў сюды яшчэ не адзін раз. Як жа гэта зрабіць правільна? Напрыклад, каманда сталічных паштавікоў стварыла спецыяльны відэаролік, у якім дасканала былі разабраны ўсе магчымыя памылкі з боку аператара. За гэта яны і атрымалі першае месца. Каманды ж з рэгіёнаў паказалі тэатралізаваныя сцэнкі і нават зладзілі «Паштовы батл».

Тэме Года малой радзімы было прысвечана асобнае заданне. Каманды павінны былі прэзентаваць малыя архітэктурныя формы, якія б адлюстроўвалі асаблівасці рэгіёнаў, што яны прадстаўляюць. Гэта было іх дамашнім заданнем. Прадстаўнікі Віцебскай вобласці, напрыклад, прывезлі металічнае дрэва, у выглядзе лісточкаў якога выступалі «крэпелькі» з назвамі гарадоў краю. З Брэсцкай вобласці прыбыла цэлая архітэктурная інсталяцыя — вялікая лаўка, плеценая біклажка, кошык з гароднінай, садавіной і сноп. Мінчане ўсталявалі вялікі макет цэнтра беларускай пошты — будынка Галоўпаштамта.

Выявіць пераможцу ў гэтай намінацыі для журы было няпростай задачай, паколькі кожная каманда праявіла творчы падыход і індывідуальнасць пры прэзентацыі малой архітэктурнай формы. Таму журы прынята аднагалоснае рашэнне прызнаць пераможцамі і ўзнагародзіць усе каманды.

Агульным жа пераможцам стала каманда Мінскага філіяла, якая атрымала дыплом і ганаровы кубак. Адна з яе ўдзельнікаў — Таццяна Шруб, начальнік аб'екта паштовай сувязі «Барысаў-5». Яна заняла першае месца сярод начальнікаў гарадскіх аб'ектаў паштовай сувязі.

— Самае складанае для мяне — гэта праверка тэарэтычных і практычных ведаў. На другі дзень конкурсу трэба было адказаць на 20 пытанняў у спецыяльным тэсце. І вось як быццам бы ўсё ведаеш, а сфармуляваць на паперы нават крыху і нязвыкла.

Цікава, што найлепшай сярод кіраўнікоў сельскіх аб'ектаў паштовай сувязі стала таксама прадстаўніца Барысаўскага раёна. Іна Жылко кіруе аддзяленнем, якое знаходзіцца ў вёсцы Ніўкі.

— Падрыхтоўка да конкурсу была працяглая, аб'ёмная. Штудзіравалі тэорыю нанова, каб ведаць кожную дробязь у абслугоўванні. Што казаць — нялёгкая наша прафесія, але вельмі адказная, патрэбная і незаменная.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ** ■



# МУЗЫЧНАЯ АРЫФМЕТЫКА ІВАНА КІРЧУКА



Пра кожную рэч іх гаспадар можа распавесці асобную захапляльную гісторыю.

## АСАБІСТАЕ

*«Ніякіх не хачу застолляў і банкетаў, не хачу шмат гасцей, хачу, каб была толькі сям'я, — дае Кірчук свой ідэальны рэцэпт юбілею. — Проста для мяне гэта вельмі важна: калі жыў сам, адзін, 14 гадоў і думаў, што ўжо так буду дажываць. А цяпер ёсць сям'я, маленькія дзеці, і трэба часцей бываць разам, як некалі мы з бацькамі. Нас было трое дзяцей у сям'і, і я добра памятаю, што на нейкія, як палякі кажуць, «рочныя» святы мы вельмі не любілі, калі прыходзілі суседзі ці іншыя людзі, бо галоўнае было — адзначыць з блізкімі, сям'ёй».*

**— Іван Іванавіч, 60 — сакральная лічба ці не?**

— Мне здаецца, чым далей ад дня нараджэння, тым больш сакральныя лічбы ўсе. Можна ўзяць і 7-гадовы цыкл, і 10-, і 12-гадовы; па сабе я ведаю, наступіўшы колькі разоў на адны і тыя ж граблі, што як толькі праходзіць 11 гадоў, трэба нешта змяняць у жыцці, інакш здараюцца розныя кшталту непрыемнасці. Нядаўна гуляў з дачушкай Агнешкай, яна кажа: «Мне тры гады». «Не, — кажу, — табе яшчэ два. А вось мне шэсцьдзясят...» І нават сам задумаўся, якая гэта вялікая розніца і колькі яшчэ ў дачкі будзе гэтых лічбаў.

**— Параўноўваючы сябе ў розных узростах, і сваіх дзяцей, як лічыце, які ўзрост найшчаслівейшы?**

— Канешне, дзяцінства, калі ты яшчэ мала каму што павінен, калі бацькі побач, калі бачыш бабулю з дзедам, асабліва калі ў сям'і лад і ніякай сваркі няма, і ў цябе ёсць лесвіца пакаленняў перад вачыма: як жывуць старыя, куды цягнуцца бацькі, куды імкнешся ты сам... Натуральна, сённяшнія дзеці — зусім не тыя, што былі мы; мае Стэфан і Агнешка зараз могуць не слухаць бацькоў, а ў маім дзяцінстве бацькава слова было святым.

**— А вы з якога ўзросту сябе свядома помніце?**

— Гадоў, мо, пяць ці шэсць. Помню, што я вельмі шмат спяваў, дзе толькі была магчымасць. Мама казала: ехалі з Гародні з гасцей, я выйшаў на сярэдзіну аўтобуса і запытаўся, ці магу я спяваць — дазволілі, то спяваў. Альбо хадзілі мы ў лес у грыбы ці ягады, і я таксама пытаўся, ці можна тут моцна спяваць. Наогул, песні любіў розныя, бо тады, калі збіралася вялікая радня, шмат на застоллях спявалі — рускіх, украінскіх, польскіх, беларускіх песень. А цяпер па мамінай лініі засталася толькі адна цётка Геня, ёй больш за 90, жыве ў Літве. Вось бы іх запісаць, калі яшчэ ўсе былі жывыя — а ўсё адкладваў, думаў, паспею...

## ЛЕТАПІСНАЕ

*На адлегласці амаль 180 кіламетраў ад Мінска ў Кірчука было лецішча — домік, падораны яшчэ матуляй. «А ўжо няма, прадалі сёлета, і там цяпер жыве ёг — беларускі хлопец, які быў у ашрамах Індыі, Германіі і Польшчы. Убачыў ён мой сад камянёў, сказаў, што гэта выдатнае месца для медытацый, — расказвае музыка. — З аднаго боку, на лецішчы добра — лес, цішыня, а з другога — ёсць пытанні, я змяю на ўчастку бачыў, калі касіў, а малыя дзеці ж глядзець не будуць, адразу рукамі ўхопяць. Дый 180 кіламетраў у адзін бок — не блізкі свет. Словам, развіталіся мы з тым домікам. Але ў жончыных бацькоў ёсць дом у Фаніпалі, там для дзяцей ёсць усё, і нават частка архіваў «Троіцы» там захоўваецца. Праўда, летась здарыўся пажар, і вінілавыя запісы «пацяклі», частка малюнкаў падгарэла...»*

— Аднаўляць страчаныя архівы? — перапытвае суразмоўнік. — А куды гэта ўсё дзяваць? Каб вы ведалі, колькі ўсяго сабралася! Восем ці дзевяць валізак тут захоўваецца толькі з дыскамі і касетамі, якія я збіраў і прывозіў з падарожжаў «Троіцы» па розных краінах: джаз, фолк, класіка, рок, танцы — на добры толк, каб гэта ўсё разабраць, бездань часу патрэбна. А яшчэ ж ё кнігі, інструменты, фотаздымкі з беларускіх і замежных фестываляў — а іх было больш за 100, ад Беларусі і Расіі да Чылі і Малайзіі... Толькі сёлета былі фестывалі ў Партугаліі, Германіі і Польшчы — відаць, 8-9 тысяч кіламетраў мы «накруцілі».



Ці пазнаеце вы Івана Іванавіча ўзору 1995-га — кіраўніка фальклорнага тэатра «Дзіва» і намесніка дырэктара Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі?

**— Налета этна-трыа «Троіца» ў, так бы мовіць, класічным складзе споўніцца ўжо 20 гадоў. Ці плануеце неяк адзначаць?**

— Тады ўжо трэба адлічваць ад гурта «Дзіва», які быў за дзесяць гадоў да «Троіцы» — ён, праўда, вельмі мала выступаў у Беларусі, але меў званне народнага і шмат гастраляваў за мяжой, спяваючы a capella беларускія песні. Сама ж з'ява «Троіцы» бярэ адлік з 1995-га, калі я працаваў у Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі намеснікам дырэктара... А ці будзем мы адзначаць 20-годдзе этна-трыа і як гэта рабіць, пакуль нават не ведаю, бо шмат якія планы даводзіцца перасоўваць. Вось узяць новы дыск «Цар агонь» — мы ж яго запісалі яшчэ летась, павінны былі вясной прадставіць, але так склалася, што толькі зараз ён прагучыць.

**— Новы альбом вы пісалі сем гадоў, ён сёмы ў агульнай дыскаграфіі, але першы, на які вы збіралі грошы талакой, праз краўдфандынг.**

— Так, 175 чалавек з розных краін падтрымалі нас і паўдзельнічалі ў зборы сродкаў на альбом «Цар-агонь». Але ў выніку атрымалася, што з яго прэзентацыяй мы спазніліся на год. Чаму? Бо хацелася захаваць такі ўзровень якасці, як у папярэднім альбоме «Зімачка», які атрымаў дзесяць узнагарод толькі ў Беларусі. Уяўляеце, якія вушы павінны быць у гукарэжысёра, калі мы ўтраіх запісалі 420 трэкаў, а ён усё гэта здолеў звесці, каб усе — і мы, і ён, і слухачы — засталіся задаволеныя працай.

**— З самага першага альбома «Троіцы», які і называўся так сама, «Троіца», ці ёсць песня, якая вам падабаецца дагэтуль?**

— Першая «Троіца», мяркую, здзівіла ўсіх мінімалізмам: на той час у нас былі бонгі з перкусіі, гуслі, смык, некалькі дудачак, ну і гітара ў Віталя Шкілёнка. І калі мы прыехалі ў Галандыю з гэтым наборам, усе казалі нам, што гэта медытацыя, транс, музычная магія... Зразумела, калі параўнаць першы альбом і сёмы, у нас з'явілася велізарная колькасць інструментаў — падчас канцэрту ў філармоніі, мабыць, будзе адчуванне, што сядзіць сімфанічны аркестр, бо ўся сцэна будзе застаўленая інструментамі, якія выкарыстоўваюцца ў праграме. А з таго часу мы заўсёды спяваем купальскую «Канапельку» («А ў гародзе на канапельцы»), дзе якраз гучаць гуслі.

## ТВОРЧАЕ

*«Я заўжды марыў стварыць фольк-тэатр, даследаваць на беларускім матэрыяле, як адбываліся тыя ці іншыя рытуалы, у якіх абрадах і чаму выконваліся пэўныя песні, у які бок ішлі... Даследчыкі-этнографы, мяркую, пагодзяцца, што беларускі фальклор — закадзіраваная інфармацыя, якая адкрывае сябе гадоў праз 20, не раней».*

**— Яшчэ 15 верасня мусіла адкрыцца выстаўка, якая прадставіла б шырокай публіцы вашу этнаграфічную калекцыю, у тым ліку батлейку, з якой вы шмат гадоў гастралявалі па свеце. Аднак большасць экспанатаў не прайшла праз польска-беларускую мяжу і засталася ў Польшчы. Ці зрушылася справа на сёння?**

— Спадзяюся, што ліст, які я напісаў у Міністэрства культуры, нешта зрушыць. Лялькі ўжо тут, калядная зорачка прыехала, і я буду выкарыстоўваць яе разам з маскамі, лялькамі і музычнымі інструментамі 23 верасня ў монаспектаклі «Дарожка мая», які ўваходзіць у праграму сёлетняга мастацкага форуму «TEART». А яшчэ планую выставіць малюнкі, частка з якіх зараз знаходзіцца на «Млыне» ў вёсцы Дворышча, што пад Лідай, — гэта сапраўдны стары трохпавярховы вадзяны млын, які Генадзь Конан аднавіў і зрабіў там культурніцкую пляцоўку. 29 верасня там таксама планую паказваць монаспектакль «Дарожка мая», таму частка калекцыі малюнкаў і інструментаў ужо чакае там... Словам, выстаўка пакуль пераносіцца, нават не магу сказаць дакладна, на які час — зразумела, яечка Хрыстова было б да абеду добра, але ўжо цяпер як атрымаецца сабраць усё разам: і музычныя рэчы, і этнаграфічныя — саламяныя карабы, начоўкі, куфар на колах з Палесся, і шмат чаго яшчэ. Вельмі хацелася б, каб яно ўсё вярнулася ў Беларусь, бо тыя рэчы заўжды дапамагалі «Троіцы» стварыць адпаведны кантэкст. Скажам, на фестывалі ў Галандыі, які доўжыўся 10 дзён, паралельна працавала выстаўка з маёй калекцыі, лялечны тэатр батлейка, які паказвалі дзецям, — на спецыяльным маніторы ішоў пераклад на галандскую мову, і прайшлі два канцэрты «Троіцы». Тое самае мы рабілі ў нямецкім Дортмундзе, у іншых гарадах і краінах... А потым неяк усе праекты спыніліся, і калекцыя шмат гадоў захоўвалася ў сяброў у Польшчы — на ёй, атрымліваецца, яшчэ стаіць штамп «Вывезена з СССР», і з 1999 года ўсё ніяк не можам завезці назад у Беларусь.

**— У лялечнай «трупе» батлейкі, калі не памыляюся, 28 персанажаў. Ці ёсць сярод іх найбольш памятныя?**

— Спачатку было меней, пачыналася праца з драмы «Цар Ірад». Але недзе ў 1986—1987 гадах, збіраючы інфармацыю пра батлейку, я вырашыў зрабіць і бытавыя сцэнкі, таму з'явіліся новыя героі: доктар і салдат, Адам і Ева, чорт ды іншыя. У мяне былі лялькі вялікія, памерам у 80 сантыметраў, для выступленняў на плошчы, але тая батлейка засталася ў Цэнтральным раёне Мінска, дзе быў цэнтр этнаграфіі, і ўжо, на жаль, няма ў жывых тых мастакоў, якія рабілі гэтыя лялькі. Пазней ужо са студэнтамі рабілі пастаноўкі адначасова з лялькамі і маскамі, таксама недзе захаваліся сцэнарыі. Каб была асаблівая гісторыя з якімсьці персанажам звязаная, не скажу, але помню адну дзіўную рэч. У 1999 годзе я атрымаў грант Сораса і паехаў у пасляваенную Боснію і Герцагавіну 20 канцэртаў даў. Прыехаў у адзін дзіцячы садок, расклаў батлейку і разумею, што мой сцэнарый ляжыць у машыне, а ўжо трэба пачынаць, і прайсці цераз залу немагчыма — пад 400 дзяцей сабралася, усе чакаюць... Што я там расказваў, на якія галасы — мне здаецца, калі б гэта запісаць, то шмат хто пасмяяўся б. А яшчэ аднойчы выступаю, зноў жа ў Босніі і Герцагавіне, а на першым радочку сядзіць хлопчык гадоў пяці і ўсе беларускія песні, што я выконваю, падпявае... Як, адкуль? Бог яго ведае.

**— Нядаўна «Троіца» была адным з хэдлайнераў ужо 10-га фольк-фэсту «Камяніца». На ваш погляд, за 10 гадоў, што мінулі, у які бок змянілася стаўленне і выканаўцаў, і слухачоў да музычнага фальклору? Ці пачалі ім больш цікавіцца?**

— Сказаў бы, што не вельмі. Вось мяркуйце: год ці два таму, казалі, на фестывалі было каля сямі тысяч гасцей. Для двухмільённага Мінска вельмі мала. А некалькі гадоў таму мы былі на найбуйнейшым фестывалі сусветнай музыкі і танца WOMAD у Англіі, які патрануе Пітэр Гэбрыел, — дык вось там было 65 тысяч наведвальнікаў. Так, нам часта прыхільнікі пішуць, што пазнаёміліся на канцэрце «Троіцы», пажаніліся і цяпер ужо слухаюць нас сям'ёй, што, канешне, прыемна. Але ці кола гэтых слухачоў вялікае, дакладна не скажу, трэба больш у моладзі пытацца, наколькі ёй цікава.




У этналабараторыі захоўваецца толькі частка вялізнага творчага і матэрыяльнага архіва «Троіцы».

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

**— Ці ёсць краіны-мары, куды «Троіца» яшчэ не даехала?**

— Японія, Кітай, магчыма Нарвегія. Чаму не? Але на сёння мы ўжо напрацавалі штосьці, і ездзіць, як 5—10 гадоў таму, напаўгалодныя ды спаць на камянях ужо не хочацца, хочацца прадставіць краіну на ўзроўні. Таму многае ўпіраецца ў грошы, як і пытанне з рэпетыцыйнай кропкай, якой у нас дагэтуль няма. Будуць грошы — будзе плён.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Напярэдадні

# Рэстаран «Вугарок» і «Ветэранскі падворак»



## Чым здзіваць наведвальнікаў абласныя «Дажынкі»

**Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі-2018» збярэ жыхароў горада і раёна, а таксама шматлікіх гасцей у Мядзеле 29 верасня.**

**Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ,** якая ўзначальвае штаб па падрыхтоўцы да свята, адзначае, што тут адрамантаваны сацыяльныя аб'екты, школы, установы культуры, жылы фонд. У прыватнасці, праведзены бягучы рамонт 32 дамоў і капітальны васьмі, абноўлена інжынерна-транспартная інфраструктура. Усё гэта зроблена сумесна з жыхарамі горада і раёна. Праекты выносілі на грамадскае абмеркаванне, прыслухоўваліся да выказванняў людзей з тым, каб ім было зручна і камфортна жыць.

У працэсе падрыхтоўкі да фестывалю старажытны Мядзел памаладзеў, канстатавала **намеснік старшыні Мядзельскага райвыканкама Іна БАРЫЕВА.** Змяніла выгляд, стала больш утульнай цэнтральная плошча, рэканструяваны амфітэатр, пабудаваны гасцінічны комплекс, дзе таксама размесціцца аддзел для рэгістрацыі шлюбаў. Падчас "Дажынак" у курортным пасёлку Нарач адкрыецца галерэя знакамітага земляка — народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. На маладзёжнай пляцоўцы пройдзе фінал абласнога конкурсу «Уладар сяла». А на «Ветэранскім падворку» прадэманструюць вырашчаную на прысядзібных участках прадукцыю пенсіянеры і ветэраны.

Бясспрэчна, важна падрыхтаваць матэрыяльна-тэхнічную базу, пляцоўку для фестывалю, але не менш важна стварыць святочную атмасферу, лічыць **начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Таццяна ХМЕЛЬ.** Будуць арганізаваны тры канцэртныя пляцоўкі. На галоўнай сцэне ў амфітэатры адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў абласнога фестывалю, а ў 20.00 — канцэртная праграма Маладзёжнага тэатра эстрады. Пасля заканчэння канцэрта начное неба па традыцыі расквеціць феерверк.

Асаблівасць сёлетніх «Дажынак» — святочнае шэсце «Дажыначная талака» з удзелам пераможцаў жніва ў суправаджэнні аматарскіх харэаграфічных калектываў Міншчыны. Наперадзе кожная дэлегацыя будзе несці дажыначны сноп і каравай з далейшай іх дэманстрацыяй на выстаўцы.

Даволі цікавай уяўляецца і выстаўка «Зямлі маёй куточак дарагі». Яе ідэя паказаць, што Міншчына вялікі агульны дом, дзе для кожнага ёсць месца, дзе захоўваюцца даўнішнія традыцыі рамёстваў, фальклору, нацыянальнай традыцыйнай кухні. Тут кожны раён прадставіць свае этна-брэнды, каб паказаць унікальнасць і непаўторнасць роднага кутка.

А яшчэ Мядзельшчына як край азёр славіцца рыбай, у тым ліку і вугром. У рэстаране пад адкрытым небам «Вугарок» усе ахвотныя пакаштуюць рыбныя стравы, прыгатаваныя прадпрыемствамі грамадскага харчавання, а на пляцоўцы «Рыбны край» удзельнікі і госці свята змогуць набыць прадукцыю рыбгасаў вобласці. Наогул, самая працяглая ў Мядзеле вуліца Набярэжная пераўтворыцца ў адзіны гандлёвы рад, падкрэсліла **начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Таццяна АБЛЯК.**

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

# І ЗНОЎ АБ АДЗІНОЦЕ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Але спачатку, раз ужо пачалі, пра Краіну ўзыходзячага сонца... Любое грамадства сутыкаецца са сваімі праблемамі. Аднак Японіі, з яе самым старым насельніцтвам у свеце (27,3 % грамадзян гэтай краіны старэйшыя за 65 гадоў), апошнім часам прыйшлося мець справу з нечаканым выклікам — старэчай злачыннасцю. Узровень колькасці арыштаў у дачыненні да пажылых людзей, асабліва жанчын, там вышэйшы, чым сярод моладзі і людзей сярэдняга ўзросту. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле Shiho Fukada Japan's Prisons Are a Haven for Elderly Women, надрукаваным у часопісе Bloomberg Businessweek.

Раней пра японскіх старых клапаціліся сем'і і мясцовыя суполкі, аднак сітуацыя мяняецца, піша аўтар. З 1980 да 2015 года колькасць пенсіянераў, якія жывуць у адзіноце, вырасла больш чым у шэсць разоў. У 2017 годзе апытанне выявіла, што 40 % злоўленых на крадзяжы пажылых людзей альбо не маюць сям'і, альбо рэдка маюць зносіны з роднымі. Часта гэтыя людзі кажуць, што ім, калі патрэбна дапамога, звярнуцца няма да каго.

Многія пажылыя японкі скардзяцца, што, маючы свой дом і сям'ю, яны не адчуваюць сябе як дома, што іх не разумеюць і ставяцца выключна як да тых, хто адказвае за хатнія справы. Напрыклад спадарыня Н., 80 гадоў (ёсць муж, сын і ўнукі), якая ўкрала ў краме кніжку ў мяккай вокладцы, фрыкадэлькі і веер, гаворыць: «Я кожны дзень была адна, і мне было вельмі самотна. Я зайшла ў кніжны ў цэнтры горада і ўкрала раман у мяккай вокладцы. Мяне злавілі і адвезлі ў паліцыю, дзе мяне дапытваў вельмі прыемны афіцэр. Ён быў так мілы. Слухаў усё, што я гаварыла. Я адчула, што мяне слухаюць упершыню за ўсё маё жыццё. Пад канец ён мякка паляпаў мяне па плячы і сказаў: «Я разумею, што вам самотна, але больш так не рабіце». Жыць у турме мне падабаецца больш. Вакол заўсёды ёсць людзі, і я не адчуваю адзіноты. Калі я выйшла з-за кратаў, я абяцала сабе, што ніколі назад не вярнуся. Але я не магла не сумаваць па жыцці ў турме»...

А зараз вернемся да Беларусі. Вядома, у нас да такога яшчэ не дайшло, але я памятаю, як год ці два таму прачытала ў адной са зводак МУС аб пажылой мінчанцы, якая выклікала міліцыю і паскардзілася на тое, што на яе нібыта напалі. У ходзе разбіральніцтва хутка высветлілася, што бабуля ўсё прыдумала, ды яна і сама ў рэшце рэшт прызналася ў гэтым. І ведаеце, што яна сказала? «Мне было так самотна, не было з кім нават пагаварыць, і я вырашыла пагутарыць хоць бы з міліцыянерам, але для гэтага патрэбна была падстава...» Адчуваеце, наколькі падобна? Розныя канцы зямнога шара, а праблемы ў людзей аднолькавыя...

## Адчайнае пачуццё адзіноты — хваравітая праява?

Я не знайшла звестак па Беларусі, але ў суседняй Расіі, напрыклад, у ходзе апытання высветлілася, што кожны дзясяты чалавек старэйшы за 65 гадоў адчувае сябе адзінокім, а яшчэ больш людзей не прызнаюцца ў гэтым і пакутуюць моўчкі. Наогул, з гадамі праца, захапленні, захаханасці, службовыя раманы і сябры пакрысе сыходзяць на другі план, і толькі сям'я не губляе сваіх пазіцый, больш за тое, набывае ўсё большую каштоўнасць. Але неадпаведнасць паміж нашымі чаканнямі ад сваіх блізкіх людзей і фактычнымі справамі прыводзіць да развіцця пачуцця адзіноты, пакінутасці і забытасці.

Праўда, нядаўна давялося пагутарыць з доктарам, якая выказала свой даволі нечаканы, хутчэй, прафесійны погляд на гэтую праблему. Алене Івашэвіч 62 гады, у яе 38 гадоў медыцынскага стажу, з якіх 24 яна працавала галоўным урачом адной са сталічных паліклінік.

— І ў мяне бываюць прыступы і дэпрэсіі, і роспачы, — гаворыць Алена Яўгенаўна. — З аднаго боку, я рада і ганаруся, што мая дачка жыве і зрабіла добрую кар'еру ў ЗША, а з другога — мне не хапае ўсіх гэтых жыццёвых радасцяў, якія могуць даць толькі блізкія людзі. Вось у мяне ёсць сяброўка, у якой серада — гэта святы дзень, таму што ў сераду да яе на вячэру прыходзяць дачка з зяцем, і аўторак таксама святы дзень, таму што ў аўторак яна рыхтуецца да гэтай вячэры. Так што на гэтыя дні яна недаступная для ўсіх сваіх сяброў, і павінна здарыцца нешта сапраўды экстраардынарнае, каб яна аддала гэты час нечаму іншаму. Вось мне таксама хацелася б такіх сямейных вячэр... Так, я часам адчуваю адзіноту, таму што дзеці вельмі далёка. Вось на лета да мяне ўнучкі прыехалі, дык, вы не паверыце, я шкла не мыю на кухні, таму што іх маленькія ручкі на ім засталіся... І мне, вядома, хацелася б бачыць іх раз у 2-3 дні, а не раз на паўгода. Але трэба глядзець на рэчы цвяроза і разумець, што маладым трэба даваць дыхаць вольна і не абцяжарваць іх сабой. І потым, у мяне таксама ёсць свае інтарэсы, свае цікавае жыццё, асобнае ад іх...


Фота носіць ілюстрацыйны характар.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Наогул, велізарнае, адчайнае пачуццё адзіноты Алена Івашэвіч лічыць хваравітай праявай. «Усе гэтыя дзіўныя формы паводзін (Алена Яўгенаўна мае тут на ўвазе факты, згаданыя ў артыкуле аб пажылых японках і не толькі) — гэта хваравітыя праявы, напрыклад, энцэфалапатыі. У нас усё старэе з часам. Нам здаецца натуральным, што ў сталым узросце баляць і не гнуцца суставы, але разам з імі старэюць і скура, і мышцы і, на жаль, мазгі. Яны ўжо не выпрацоўваюць патрэбнай колькасці нейрамедыятараў, напрыклад»... Выхад наша суразмоўніца бачыць у адэкватнай медыкаментознай тэрапіі. «Ёсць, дапусцім, прэпараты, якія паляпшаюць структуру мозга, — кажа яна. — Іх даюць неданошаным дзеткам, каб даспеў іх мозг. Тое ж самае лячэнне праводзяць і ў сталым узросце. Але, каб правесці курс такой тэрапіі, трэба, каб чалавек звярнуўся па медыцынскую дапамогу. А беларуская бабуля ніколі не прыйдзе ў паліклініку з такімі скаргамі, у нас не той менталітэт. Вось на суставы яна паскардзіцца, на галаўны боль, боль у сэрцы... А на дрэнны настрой, на тое, што жыць не хочацца, — не... Чаму такой складаная з'яўляецца прафілактыка самагубстваў сярод старых? Таму што яны нікому нічога не гавораць. Яны зашываюцца ў сябе дома, сядзяць там моўчкі, а потым надумаюць — і зробяць з сабой што-небудзь... Наогул, узровень самагубстваў сярод старых 70—80 гадоў вельмі высокі, хоць гэта ў прынцыпе вырашальная праблема. Але ў нас вельмі баяцца звярнуцца да псіхіятра»...

Напрыклад, дэпрэсія, па словах доктара, можа мець самыя розныя праявы. «У маёй медыцынскай практыцы быў выпадак, калі ў пацыенткі быў перадінсультны стан (кажучы медыцынскай мовай, назіралася клініка транзісторных ішэмічных атак), — расказвае Алена Івашэвіч. — Я як доктар лячыла яе ад гэтага на працягу двух гадоў. А потым яна з'ездзіла да дачкі ў Маскву, і тая ўгаварыла яе схадзіць да псіхіятра. Псіхіятр выпісала пацыентцы антыдэпрэсанты і сказала, што ўсё, што ў яе было, — гэта праявы дэпрэсіі. Так яно і аказалася. У гэтай жанчыны пасля трох месяцаў прыёму антыдэпрэсантаў усё стабілізавалася, перасталі аднімацца мова, рука і нага, зніклі і ўсе астатнія сімптомы перадінсультнага стану — і прэпараты, якімі мы яе лячылі, аказаліся непатрэбнымі. Калі мы сталі з ёй размаўляць, то высветлілася, што яна насамрэч перажывала тады ў псіхалагічным плане няпростыя часы. У яе на той момант склалася так, што яе маці памірала ад раку, а дочкі ўладкоўваліся ў жыцці вельмі складана, ведаеце, «паляцелі сваімі крыламі», але пакуль уладкаваліся, сэрца ў мамы за іх балела... Вось усё гэта ў цэлым і прывяло да таго, што маю пацыентку «накрыла»... Я гэта да таго, што не трэба баяцца звяртацца па дапамогу да спецыялістаў. Увесь цывілізаваны свет не баіцца ні псіхолагаў, ні псіхіятраў, толькі мы чамусьці адчуваем перад імі непераадольны страх»...

* * *

Увогуле, тут ёсць да чаго прыслухацца, і тое, што ўзроставыя фізіялагічныя змены ўплываюць на вельмі многае, у тым ліку і на псіхічны стан, ніхто не адмаўляе. Канешне, гэта так. Але, каб не даць чалавеку скаціцца ў «дажыванне» (а дэпрэсія пажылых — вельмі распаўсюджаная праблема), не будзе лішнім, калі блізкія таксама падтрымаюць у яго цікавасць да жыцця. Лішні раз патэлефанаваць і пагаварыць са сваёй маці ці бабуляй — гэта не такая вялікая ахвяра. Яшчэ адзін шлях вырашэння праблемы — можна навучыць яе валодаць камп'ютарам, карыстацца інтэрнэтам, і яна ўжо сама знойдзе чым сябе заняць у сучасным лічбавым свеце. І чым больш шчаслівай будзе яе старасць, тым менш будзем баяцца старасці мы самі...

**Святлана БУСЬКО.**

# Сітуацыя пад кантролем

## Якім будзе вірус грыпу сёлета?

**Згодна з прагнозам Нацыянальнага цэнтра па грыпе і іншых рэспіраторных захворваннях, у гэтым сезоне чакаецца сярэдні ўзровень эпідэміялагічнай актыўнасці вірусаў грыпу, паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.**

Ва ўзроставай групе захварэлых будуць пераважаць дзеці да 14 гадоў. У групы рызыкі ўключаюць таксама цяжарных жанчын і людзей ва ўзросце ад 65 гадоў, а таксама тых, хто мае хранічныя хваробы, асоб з імунадэфіцытам, медыцынскіх работнікаў, асоб ва ўстановах з кругласутачным знаходжаннем, работнікаў адукацыйных устаноў.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя, якая кіруецца данымі назірання за цыркуляцыяй вірусаў грыпу, у Паўночным паўшар'і рэкамендуе сёлета наступны склад трохвалентных сезонных вакцын:

вірус, падобны да A/Michigan/45/2015 (H1N1)pdm09;

вірус, падобны да A/Singapore/INFIMH-16-0019/2016 (H3N2);

вірус, падобны да B/Colorado/06/2017 (лінія B/Victoria/2/87).

Сёлета, як і раней, кампанія вакцынацыі супраць грыпу будзе ажыццяўляцца за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама за сродкі прадпрыемстваў, арганізацый і грамадзян. Групы рызыкі могуць атрымаць прышчэпкі бясплатна з выкарыстаннем вакцыны «Грыпол Плюс» расійскай вытворчасці. Для платнай вакцынацыі даступныя вакцыны іншых вытворцаў. Усе яны зарэгістраваны на тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца эфектыўнымі і ўтрымліваюць актуальныя штамы віруса, рэкамендаваныя Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя ў Паўночным паўшар'і ў 2018 годзе.

Неабходная колькасць вакцыны паступіла ўжо ў краіну. Зараз яна праходзіць кантроль якасці. Кампанія вакцынацыі распачнецца з 1 кастрычніка, завяршыць яе плануюць да 1 снежня. Высокаспецыфічны імунітэт фарміруецца праз 7—14 дзён пасля прышчэпкі і захоўваецца да 6—12 месяцаў.



Летась прышчэпкі ад грыпу атрымалі 40,5 % беларусаў. Дзякуючы гэтаму, як адзначаюць спецыялісты, эпідэміялагічная сітуацыя па грыпе падтрымліваецца ў краіне на стабільным узроўні. З лістапада 2017 года да сакавіка 2018-га дзякуючы праведзенай вакцынацыі было папярэджана больш за 135 тысяч выпадкаў грыпу (у тым ліку больш за 16,2 тысячы выпадкаў ускладненых формаў), больш за 182 тысячы выпадкаў вострых рэспіраторных інфекцый негрыпознай этыялогіі. Папярэджаны эканамічны ўрон спецыялісты ацэньваюць у 76,8 мільёна долараў, а кожны ўкладзены ў вакцынацыю долар прынёс эфект у эквіваленце 15,8 долара.

Ахапіць прафілактычнымі прышчэпкамі супраць грыпу сёлета плануецца не менш за 40 % насельніцтва, у тым ліку 75 % тых, хто адносіцца да груп рызыкі.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# Гармон і Я

## Аддаляе старасць ці павялічвае рызыку анкалогіі?

**Лішняя вага, бяссонніца, прылівы, парушэнні ціску і астэапароз — далёка не ўсе праявы, якія падпільноўваюць жанчыну ў пэўным узросце. Вырашыць іх можна з дапамогай замяшчальнай гарманальнай тэрапіі (ЗГТ). Яна аднаўляе дэфіцыт палавых гармонаў, якія з узростам перастае выпрацоўваць арганізм, і захоўвае прыгажосць і здароўе. Праўда, у нас да яе ставяцца часам з вялікай боязлю, у той час як у Еўропе глядзяць як на панацэю, якая лечыць абсалютна ўсё. Які падыход правільны, мы разбіраліся з акушэрам-гінеколагам 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі Мінска Аляксандрай БУРГУТАЙ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Аляксандра Дзмітрыеўна, як на здароўе жанчыны ўплывае наступленне перыяду менапаўзы? Магчыма, яго негатыўных праяў можна пазбегнуць і без таблетак, калі займацца спортам, наведваць басейн?***

— У кожнай жанчыны гэты перыяд працякае вельмі індывідуальна і спрагназаваць яго складана. Вялікую ролю адыгрывае генетычны фактар — як адчувала сябе бабуля, маці, старэйшая сястра. Мае значэнне таксама наяўнасць у жанчыны пэўных захворванняў, не звязаных з мочапалавой сістэмай. Адназначна ўзмацняе цячэнне клімаксу артэрыяльная гіпертэнзія, атлусценне, парушэнне работы шчытападобнай залозы, у прыватнасці гіпатэрыёз, цукровы дыябет. На жаль, шмат жанчын ужо маюць такія хваробы падчас наступлення менапаўзы. Але здараецца, што і здаровая жанчына, якая займаецца спортам, мае ідэальную вагу, таксама моцна пакутуе ад праяў клімаксу.

***— Што адчувае ў гэты час жанчына?***

— Сімптомы клімаксу прынята падзяляць на дзве групы: раннія і аддаленыя. Раннія — гэта найперш гарачыя прылівы, калі жанчына раптам адчувае, што ўнутры адбываецца быццам бы выбух, у яе чырванеюць твар і шыя, павышаецца тэмпература цела, але на працягу хвіліны ўсё праходзіць. Па колькасці прыліваў і вызначаюцца ступені цяжкасці: менш за 10 разоў у суткі — лёгкая ступень, а калі больш за 25 — гэта цяжкая ступень працякання клімактэрычнага сіндрому. Дадаткова з ранніх сімптомаў можна вылучыць нервознасць, парушэнні памяці, сну, перапады настрою. Што датычыцца аддаленых сімптомаў, то не ўсе жанчыны пра іх ведаюць. Адным з іх з'яўляюцца урагенітальныя расстройствы — жанчыны пакутуюць ад праяў сухасці ў похве, дыскамфорту і балючасці падчас палавога акту, адсутнасці лібіда і жадання палавых зносін. Таксама можа з'явіцца праблема з мочаспусканнем і мочааддзяленнем — напрыклад, падцяканне мачы, міжвольнае мочаспусканне, што жанчыны часам звязваюць з узростам, аднак гэта памылковы погляд, бо так сябе праяўляе дэфіцыт эстрагенаў. Другім значным аддаленым сімптомам з'яўляецца астэапароз — разрэджванне коснай тканкі, асабліва ў тых жанчын, у якіх такія парушэнні былі раней, — пацыенткі назіраліся з астэапеніяй, мелі парушэнні абмену кальцыю і іншыя. Гэты сімптом праяўляецца даволі ярка, і, акрамя боляў у пазваночніку, касцях, здараюцца паталагічныя пераломы ў выніку нязначнага траўміравання — кампрэсійны пералом пазваночніка і шыйкі сцягна. З гэтым пацыенткі сутыкаюцца пасля 70, а часам нават і раней.

Таксама лічыцца, што ў жанчыны, якая мае пэўныя праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай, у перыяд менапаўзы, як асноўны, так і аддалены, можа назірацца пагаршэнне: адбываецца павышэнне артэрыяльнага ціску, некантралюемыя гіпертанічныя крызы, узмацненне ішэмічнай хваробы сэрца. Гэта, бадай, асноўныя дастаткова значныя групы захворванняў, якія так ці інакш маюць сувязь з наступленнем менапаўзы.

***— У гэты перыяд жанчына з-за недахопу гармонаў набывае лішнюю вагу, скура страчвае пругкасць, павышаецца раздражнёнасць і плаксівасць — многіх такія змены палохаюць. Замяшчальная гарманальная тэрапія выглядае як выратаванне...***

— На самай справе ЗГТ можа аблегчыць і зняць шэраг сімптомаў пералічаных мной хвароб. Істотна ж, што далёка не ўсім яна паказана. Калі клімакс наступае своечасова — у прамежак ад 50 да 55 гадоў, калі жанчына не мае на гэты момант цяжкага астэапарозу, сур'ёзных сардэчна-сасудзістых захворванняў, нармальна сябе адчувае, то лячэнне не паказана. Калі ж мы маем справу з цяжкім клімаксам — 25—30 прыліваў у суткі, пацыентка не можа нармальна ні працаваць, ні кантактаваць у сям'і, калі па выніках дэнсітаметрыі назіраецца значнае пагаршэнне астэапарозу, то адназначна пры адсутнасці супрацьпаказанняў неабходна ЗГТ.

**«Напрыклад, 15 гадоў таму жанчына перанесла рак малочнай залозы ці рак цела маткі. Нягледзячы на тое, што сёння яна адчувае сябе добра, усё роўна гэта супрацьпаказанне да прызначэння замяшчальнай гарманальнай тэрапіі».**

***— Самастойна жанчына можа прымаць гарманальныя прэпараты? Ці гэтага ўсё ж лепш не рабіць?***

— У нас немагчыма самому сабе прызначыць гарманальную тэрапію, бо гэта рэцэптурныя прэпараты. Але на вялікі жаль, існуюць выпадкі, калі жанчына па парадзе сяброўкі ці калегі ў суседніх краінах нейкім чынам набывае гарманальны прэпарат. Вельмі важна, каб пацыентка, якой плануецца прызначэнне ЗГТ, была абследавана, і ўрач цалкам выключыў супрацьпаказанні. Да іх адносіцца найперш гормоназалежныя пухліны жаночых палавых органаў і малочнай залозы, як правіла, злаякасныя, якія былі пацверджаны гісталагічна. Нават калі яны пралечаны. Напрыклад, 15 гадоў таму жанчына перанесла рак малочнай залозы ці рак цела маткі. Нягледзячы на тое, што сёння яна адчувае сябе добра, усё роўна гэта супрацьпаказанне да прызначэння замяшчальнай гарманальнай тэрапіі, бо гэта гармоназалежныя рак. Другая група — недаабследаваныя жанчыны. Напрыклад, у пацыенткі маецца кровацячэнне няяснага паходжання. Магчыма, гэта проста збой у цыкле, а верагодна, і перадумовы да раку эндаметрыя. Яшчэ адна група — жанчыны з захворваннямі печані (пячоначнай недастатковасцю, пухлінамі печані). Да групы рызыкі адносяцца і жанчыны, якія маюць у анамнезе трамбозы або схільныя да іх. Гэта выяўленыя генетычныя анамаліі сістэмы згусальнасці крыві, антыфасфаліпідны сіндром, эпізоды трамбозаў у анамнезе. Сюды можна адносіць і некаторыя парушэнні мазгавога кровазвароту, інсульты, звязаныя з трамбозамі галаўнога мозга. Эстрагены, якія паступаюць звонку, могуць павышаць рызыку трамбозаў.

***— Як доўга можна прымаць замяшчальную гарманальную тэрапію?***

— Найперш значэнне мае ўзрост жанчыны. Калі менапаўза наступіла задоўга да 50 гадоў, скажам, у 40, то такая жанчына адэкватныя дозы замяшчальнай гарманальнай тэрапіі мусіць прымаць прыналмсі да ўзросту натуральнага наступлення менапаўзы — да 50. Калі жанчына пачынала прымаць гарманальныя прэпараты пасля 50, то тут падыход індывідуальны. Вельмі важна падабраць правільную, мінімальна эфектыўную дозу, і такой яна застаецца ў сярэднім 3—5 гадоў. Усе сусветныя даследаванні сведчаць, што прыём ЗГТ бяспечны і не выклікае ніякіх пабочных эфектаў, у прыватнасці рызыкі раку малочнай залозы і жаночых палавых органаў. Але размова ідзе аб прыёме не больш 10 гадоў, бо даўжэй даследаванні не праводзіліся. Магчыма, і на дзявяты, далей ЗГТ таксама бяспечная, але навукова пацверджаных даных пакуль няма. Як правіла, на перыяд у 5—8 гадоў ЗГТ і прызначаецца. Прэпаратаў на рынку зараз вялікая колькасць і карэгіраваць дозу не складана. Доза, дарэчы, паступова паніжаецца, але не рэзка, каб не ўзнікала сіндрому адмены.

У нас існуе пэўная праблема гармонафобіі. Прычым яна мае месца не толькі сярод пацыентак, але і сярод урачоў: «Вам 60 гадоў, навошта вам гармоны, іх трэба адмяняць!» А вось гінеколагі-эндакрынолагі заўсёды прыводзяць у прыклад каралеву Вялікабрытаніі Елізавету II, якая, нягледзячы на паважаны ўзрост, працягвае прымаць ЗГТ, каб захоўваць прывабны знешні выгляд, памяць і яснасць розуму. Па вялікім рахунку, жанчына таксама павінна браць на сябе адказнасць за пачатак і заканчэнне прыёму ЗГТ. Калі яна, нягледзячы на ўзрост, хоча працягваць прымаць гарманальныя прэпараты, трэба абмяркоўваць гэта з лечачым урачом. Ён ацэньвае ўзровень карыснасці і рызыкі, і калі падчас абследавання не выяўлена ніякіх супрацьпаказанняў, чаму б не працягваць?

**«Вельмі важна, каб пацыентка, якой плануецца прызначэнне ЗГТ, была абследавана, і ўрач цалкам выключыў супрацьпаказанні».**

***— Якія абследаванні павінна праходзіць жанчына, якая атрымлівае замяшчальную гарманальную тэрапію?***

— Важна разумець, што гарманальная тэрапія — не вітаміны. Калі вы пачалі яе прымаць, рабіце гэта пастаянна, без самастойных перапынкаў, адмен ці замен. Неабходна пільна прытрымлівацца той лініі, што прызначана ўрачом. Ёсць комплекс штогадовага абследавання, якое важна праходзіць на фоне прыёму ЗГТ. Гэта абследаванне малочных залоз — агляд урача і інструментальныя метады пры неабходнасці: ультрагукавая дыягностыка (УГД) ці мамаграфія. Абследаванне малога таза: мазок на анкацыталогію і УГД, якая дазваляе ацаніць стан яечнікаў і слізістай паласці маткі, бо яны могуць рэагаваць на прыём гармонаў новаўтварэннямі. Акрамя гэтага, раз на год рэкамендуецца здаваць агульны аналіз крыві і біяхімічны аналіз з пячоначнымі паказчыкамі, а таксама аналіз крыві на згусальнасць. Калі ў жанчыны ёсць варыкознае расшырэнне вен, то пажадана паказацца хірургу і пры неабходнасці рабіць УГД вен ніжніх канечнасцяў. Не вельмі складаныя штогадовыя абследаванні, і варта іх праходзіць абавязкова.

■ Знак якасці

# ДРУГІ ДОМ ДЛЯ

## або Чаму з ЛЭМТа не бягуць людзі,



**Навукова-тэхнічны цэнтр «ЛЭМТ» БелОМА» створаны ў 1992 годзе шляхам рэарганізацыі аднаго з падраздзяленняў БелОМА — Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання. Сёння гэта передавое прадпрыемства, якое валодае прафесійным кадравым патэнцыялам, некалькімі канструктарскімі падраздзяленнямі, серыйнай і доследнай вытворчасцямі. НТЦ «ЛЭМТ» (лазеры ў экалогіі, медыцыне, тэхналогіі) спецыялізуецца на выпуску навукаёмістых высокатэхналагічных лазерна-аптычных, оптыка-механічных, оптыка-электронных прыбораў, вырабаў, вузлоў і лазерных сістэм для прамысловасці, медыцыны, будаўніцтва і ваеннай галіны. З дня заснавання прадпрыемства ў 1992 годзе ім кіруе доктар фізіка-матэматычных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей Шкадарэвіч. На чале з таленавітым вучоным, здольным кіраўніком з кожным годам ЛЭМТ набірае абароты, укараняе ў вытворчасць новыя распрацоўкі і тэхналогіі.**



Дырэктар «НТЦ «ЛЭМТ» БелОМА» Аляксей ШКАДАРЭВІЧ.

# Валодаць інфармацыяй — валодаць светам

На прадпрыемстве створана новая структура — падраздзяленне інфармацыйных тэхналогій. Гэта своеасаблівы мазгавы цэнтр, дзе сабраны таленавітыя распрацоўшчыкі. Тут нараджаюцца ідэі, якія перарастаюць ў новыя віды прадукцыі. Гэта складаная разумовая праца, якой займаюцца прафесіяналы высокага класа.



Намеснік дырэктара па інфармацыйных тэхналогіях Станіслаў РУДЗІКАЎ дэманструе прыцэльную сістэму для мабільнага комплексу спецыяльнага прызначэння.

— Мая работа пачыналася з шэрагу праектаў і пэўных праблем. На прадпрыемстве не ведалі, як іх вырашыць. Яны былі звязаныя з айці-тэхналогіямі. Ставілася задача аб'яднаць тую школу, што ёсць у оптыцы і электроніцы, з сучаснымі дасягненнямі ў гэтых сферах. Усё гэта дазволіла зрабіць прадукцыю, што выпускаем, канкурэнтаздольнай, — кажа **намеснік дырэктара па інфармацыйных тэхналогіях Станіслаў РУДЗІКАЎ.**

Першы праект, які пачынала падраздзяленне, — распрацоўка прыцэльнай сістэмы для мабільнага комплексу спецыяльнага прызначэння. Комплекс устаноўлены на спецыяльнае рухомае шасі, навядзенне ажыццяўляецца з дапамогай дыстанцыйнакіруючага блока, які можа быць аддалены на 300 метраў ад пускавой устаноўкі.

— Вельмі важная тэма, звязаная са зборам інфармацыі. Хто валодае інфармацыяй, той валодае светам, — упэўнены Станіслаў Ігаравіч. — Уласна кажучы, усе прыборы, што мы распрацоўваем, — гэта сістэмы збору інфармацыі. Напрыклад, для нашых ваенных распрацавалі камбінаваны прыбор назірання разведчыка з шырокім спектрам функцый. Гэтая разумная тэхніка можа вызначаць каардынаты цэлі, захоўваць і перадаваць звесткі на камандныя цэнтры і партатыўныя камп'ютары. Мы стараемся быць на вастрыі навукі, карыстацца ўсім, што сёння даюць сучасныя тэхналогіі. Аб'ядноўваем тэхніку і навуковыя веды ў адно цэлае, каб выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю. Але сёння недастаткова валодаць тэхналогіямі. Для іх прымянення неабходныя пэўная філасофія мыслення ў людзей, новае мысленне. Растлумачу. Прыходзім на работу з дакладным разуменнем: што ты робіш і для чаго гэта трэба. Акрамя таго, грошы не заўсёды з'яўляюцца стымулам для творчага пошуку. Маладым спецыялістам цікава ўжо тое, што яны ўдзельнічаюць у праектах, якія нейкім чынам мяняюць свет. Такога прыбора раней не існавала, пакуль ты не сеў за сваё рабочае месца, не аб'яднаў групу людзей і не растлумачыў, што трэба рабіць. Мы стараемся так уладкоўваць рабочыя месцы, каб было прыемна працаваць. Мы не прымушаем чалавека працаваць, яму гэта самому цікава. Уласна кажучы, у гэтым заключаецца наша філасофія.

***— А больш канкрэтна аб інфармацыйных тэхналогіях?*** — звяртаюся да свайго суразмоўніка.

— Інфармацыйныя тэхналогіі — гэта тое, што мы выкарыстоўваем. Напрыклад, ёсць сучасныя працэсары, якія маюць шэраг пераваг па сваіх характарыстыках: нязначнае электраспажыванне дазваляе працаваць больш працяглы час. Перавага іх у малых габарытах, высокай прадукцыйнасці, — канстатуе Станіслаў Рудзікаў. — Шмат новых тэхналогій, для якіх патрэбны спецыфічныя веды, навыкі, вопыт, неабходна ведаць матэматыку, тонкасці праграмавання, устройства электронікі, працэсараў. Уласна, гэта тое, чым займаемся.

У першую чаргу задача распрацоўшчыкаў — укараняць на прадпрыемстве новае, тое, чаго раней не было. Бачаць, што ў сучасным свеце з'явілася нейкая новая тэхналогія, бяруцца за яе ў прымяненні да оптыкі. Напрыклад, займаюцца цеплавізарамі — прыборамі, якія могуць бачыць ноччу. Ёсць цеплавізары ахаладжальныя, дзе ўстройства падтрымлівае пэўную тэмпературу сэнсара для таго, каб ён мог працаваць. Гэты прыбор валодае вялізнай адчувальнасцю, можа «бачыць» далёка і ў начны час.

Ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Беларусі, ёсць праблема выяўлення беспілотных лятальных апаратаў. Квадракоптары танныя, і набыць іх могуць многія. І дзе гарантыя, што хтосьці не здзейсніць супрацьпраўнае дзеянне? Распрацоўшчыкі ЛЭМТа паставілі за мэту і зрабілі комплекс па выяўленні і суправаджэнні беспілотнікаў «Зоркі». Ён здольны візуальна вызначыць у небе нават самы маленькі дрон на вялікай адлегласці. Комплекс прызначаны і для адсочвання наземных аб'ектаў: ваеннай тэхнікі і людзей.

— Гэта наша ноу-хау, такія комплексы выпускае толькі некалькі краін свету. Сучасныя тэхналогіі ўплываюць на выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі, даюць людзям работу і магчымасць зарабіць. Інакш кажучы, наша праграма забеспячэння інфармацыйных тэхналогій загружае вытворчасць, — кажа намеснік дырэктара.

***— Адсочваеце сучасныя тэхналогіі па ўсім свеце і яшчэ нешта сваё прыўносіце?***

— Так, адаптуем іх пад нейкія новыя задачы або ўносім нешта сваё.



Вядучы інжынер-даследчык Аляксей ШЫНКЕВІЧ правярае на аптычнай лаве прыцэл.

# КАЛЕКТЫВУ,

## а трапляюць сюды на работу найлепшыя з найлепшых



Слесары механазборачных работ шостага разраду Валерый АЛЕФІРЭНКА і Аляксандр РАМАНОЎСКІ правяраюць цеплавізійны аптычны выраб.



Каліматарны прыцэл прызначаны для максімальна дакладнага пападання ў цэль.

***— Гэта цяжка?***

— Работа распрацоўшчыка адна з самых цікавых і, мабыць, самых цяжкіх, — прызнаўся Станіслаў Рудзікаў. — Ён ідзе па нязведаных сцежках. Перад ім стаіць задача, якую яшчэ ніхто не рашаў. Трэба, па-першае, спланаваць сваю работу па тэрмінах, у якія ён укладзецца. Таксама неабходна яшчэ гарантаваць, што гэта запрацуе, будзе вынік, таму што ў гэта ўкладваюць грошы і ён за ўсё нясе адказнасць. Бывае, што нешта пойдзе па іншым шляху. Таму кожны дзень адчуваеш пэўны стрэс.



Мантажніца радыёэлектроннай апаратуры Наталля КУРЦЭВІЧ робіць мантаж платы лазернага дальнамера.




Аператар станкоў ПУ трэцяга разраду Уладзімір ПЕРШЫН.

# Як адпачнеш, так і папрацуеш

Вядома, што ў работнікаў і спецыялістаў такога сур'ёзнага прадпрыемства напружаныя будні, якія патрабуюць разумовых і фізічных высілкаў, нестандартнага мыслення. Таму тут добра разумеюць, што людзі павінны адпачываць, каб набрацца сіл для новых праектаў, стварэння новых відаў прадукцыі. Вялікую ўвагу ўдзяляюць спартыўнаму, культурнаму адпачынку, ладзяць шмат цікавых мерапрыемстваў з выездам на прыроду, розных забаўляльных конкурсаў. І, вядома, найлепшы адпачынак — гэта спорт, які падымае настрой, стварае азарт, пачуццё сяброўскага локця і мацуе камандны дух, узаемавыручку.

— У нас спартыўнаму жыццю — асаблівая ўвага. Ладзіцца шмат гульняў, спаборніцтваў, — расказвае **старшыня прафсаюзнага камітэта Жанна АКСЁНЧЫК.** — Круглы год яны праходзяць як ў межах БелОМА, так і ў межах нашага прадпрыемства па розных відах спорту і на даволі высокім прафесійным узроўні. З задавальненнем нашы работнікі ўдзельнічаюць у летніх спартакіядах і турыстычным злёце. Ахвотных шмат, з кожным годам колькасць удзельнікаў павялічваецца, канкурэнцыя ўзрастае, каманды растуць. У нас з'яўляюцца новыя маладыя арганізатары па фізкультуры. У іх свой свежы, прафесійны погляд на арганізацыю масавай фізкультурнай і спартыўнай работы. Яны ўносяць свае прапановы па яе паляпшэнні, прыцягненні найбольшай колькасці ўдзельнікаў. Ужо некалькі гадоў наша каманда трымае першае месца сярод камандаў холдынга па валейболе.

Чалавеку здаўна ўласцівы цяга да падарожжаў, жаданне спазнаваць новае, нязведанае, адкрываць для сябе новыя мясціны. У ЛЭМТ арганізуецца шмат паездак, экскурсій па лініі адміністрацыі, за прафсаюзныя сродкі. Работнікі прадпрыемства аб'ездзілі практычна ўсе гарады і славутыя мясціны Беларусі, мала месцаў засталося, дзе б яны не пабывалі. Адна справа паглядзець славутасці самім, зусім іншая — калі пра ўсё раскажа прафесіянал. Таму без экскурсавода не абыходзіцца ні адна паездка. Такія вандроўкі па родным краі дазваляюць бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй таго ці іншага населенага пункта, яго асаблівасцямі, архітэктурай, знакамітымі ўраджэнцамі. А гэта ў сваю чаргу выклікае пачуццё патрыятызму і гонару за сваю Радзіму. Апошнім часам на прадпрыемстве ладзяцца і замежныя паездкі ў краіны Еўропы, СНД. Такія сумесныя вандроўкі аб'ядноўваюць калектыў, даюць магчымасць бліжэй пазнаёміцца, пасябраваць. А значыць, і па рабоце, калі неабходная парада, дапамога, можна звярнуцца да новых знаёмых.

— Мы бяром у паездкі ўсіх, хто хоча, не было выпадку, каб камусьці адмовілі. Неабходны большы аўтобус — будзе, трэба вагон — заказваем, — кажа Жанна Мікалаеўна. — Хто жадае — бярэ сваякоў, сяброў, адпаведна, для іх кошт паездкі большы. Для сваіх жа работнікаў вельмі выгадная цана.

Вядома, пасля такіх падарожжаў у людзей павышаецца эмацыянальны настрой, яны дзеляцца новымі ўражаннямі, звесткамі з роднымі, блізкімі. І вядома, уплываюць на добры працоўны настрой.

***Галіна Радзько, вядучы канструктар:***

*— Працую на прадпрыемстве з 1995 года. Ніколі не задумвалася аб тым, каб пайсці адсюль: трымае мяне тут цікавая работа, дружны калектыў. З моманту заснавання ЛЭМТ стаў адным з найлепшых, передавым, вядучым у краіне. Шмат чаго тут змаглі стварыць новага. Не ўсюды так клапоцяцца аб сваіх работніках, не ўсюды такія сацыяльная абарона, актыўная прафсаюзная арганізацыя, арганізацыя БРСМ.*

*У нас вельмі таленавіты дырэктар, граматны кіраўнік. Такога трэба пашукаць! Аляксей Пятровіч вельмі добра адносіцца да людзей, заўсёды ўваходзіць у іх становішча. Усё, што звязана з ЛЭМТам, — гэта цалкам заслуга нашага кіраўніцтва. Усе задаволеныя зарплатай. Адсюль людзі не бягуць, а, наадварот, ахвотных трапіць на наша прадпрыемства шмат.*

***Уладзімір Сафонаў, інжынер-даследчык другой катэгорыі:***

*— Можна сказаць, прадпрыемства для мяне, думаю, і для ўсіх маіх калег, — гэта другі дом, дзе праводзім дастаткова шмат часу. Трымаюць мяне тут цудоўны калектыў, цікавая работа, дастойная зарплата.*

— У нас калектыў — адна вялікая дружная сям'я. Мы імкнёмся ўнікаць у жыццё кожнага работніка. Жыццё ёсць жыццё, і ў ім здараюцца непрадбачаныя сітуацыі ў сям'і, быце. Мы нікому не адмовілі ні ў маральнай, ні ў матэрыяльнай падтрымцы. Калі прафсаюз не спраўляецца сам, на дапамогу прыходзіць адміністрацыя, — адзначае Жанна Аксёнчык. — Сацыяльны пакет адпаведна калектыўнаму дагавору таксама даволі значны. — У прыватнасці, дапамагаем усім без выключэння работнікам сабраць у школу першакласнікаў. Гэтых грошай хапае, каб напоўніць самым неабходным школьны партфель. Шматдзетным і няпоўным сем'ям штогод выдзяляем для падрыхтоўкі да школы дапамогу на кожнае дзіця. Мы таксама віншуем нашых юбіляраў, уручаем прыгожы букет, падарунак. Здавалася б, дробязь, а чалавеку прыемна. Ладзім навагоднія ранішнікі для дзяцей, з Дзедам Марозам і Снягуркай, уручаем ім салодкія падарункі.

Не забываюць на прадпрыемстве і тых, хто аддаў яму найлепшыя гады, а цяпер на пенсіі. Іх віншуюць на Дзень пажылых людзей, аказваюць матэрыяльную дапамогу. Яны застаюцца «прыпісанымі» да заводскай медсанчасці, куды могуць звярнуцца ў любы час для медыцынскага абследавання, скарыстацца любымі медыцынскімі паслугамі. Установа аховы здароўя аснашчана ўсім неабходным сучасным абсталяваннем, тут працуюць кваліфікаваныя спецыялісты. Ды і ў цяперашніх работнікаў не баліць галава, дзе можна хутка атрымаць якасную медыцынскую дапамогу, прайсці камісію, — усё тут, побач, на месцы.

На ЛЭМТ прыходзіць шмат маладых спецыялістаў. Вядома, для таго каб ад работніка была аддача на рабочым месцы, яму павінны быць створаны бытавыя, жыллёвыя ўмовы. Які ж з чалавека работнік, калі ён не ведае, дзе яму пераначаваць, прытуліць галаву. На прадпрыемстве з такімі праблемамі навічкі не сустракаюцца. Халасцякам і незамужнім выдзяляюць месца ў камфартабельным інтэрнаце, а сем'і атрымліваюць цэлы пакой. Калі камусьці не хапіла месца, яму кампенсуюць аплату арэнды жылля, пакуль не вызваліцца месца ў інтэрнаце. Акрамя таго, завод Вавілава пабудаваў жылы дом, у якім атрымаюць кватэры і работнікі ЛЭМТа.

— Адміністрацыя клапоціцца аб тым, каб для работнікаў былі ідэальныя ўмовы працы. Закупляе сучаснае абсталяванне, пастаянна ўкараняюцца новыя тэхналогіі, прыборы, ва ўсіх памяшканнях кандыцыянеры, новая мэбля, камп'ютары, у цэхах — новыя станкі. Аптычная вымяральная лабараторыя аснашчана па апошнім слове тэхнікі. Сочым за навінкамі і ўкараняем усё перадавое. Ва ўсіх пачынаннях наш дырэктар падтрымлівае моладзь, якая прапаноўвае інавацыйныя ідэі, не баіцца даручаць маладым спецыялістам складаныя праекты, і яны спраўляюцца. Словам, сплаў вопыту, маладой энергіі, дапытлівасці дае канчатковы вынік, — кажа старшыня прафкама.

На прадпрыемстве ёсць пакой для прыняцця ежы з усім неабходным: халадзільнікам, мікрахвалёўкай, кавамашынай, чайнікам, электраплітой, дзе можна разагрэць «ссабойку». Можна схадзіць у сталовую на тэрыторыі завода Вавілава, работнікам холдынга па пропуску даюць зніжку. Тут можна смачна і нядорага падсілкавацца: кошт паўнавартаснага абеду — 3-4 рублі.

Акрамя таго, работнікам па іх заявах аказваюць садзейнічанне па набыцці пуцёвак у профільныя санаторыі Беларусі па прызначэнні ўрача. Часткова кошт кампенсуе наймальнік. Для членаў прафсаюза дзейнічае зніжка. Не пакідаюць без клопату і дзяцей. Для іх імкнуцца выбраць найлепшы летні аздараўленчы лагер. Бацькі аплачваюць толькі 10 % ад кошту пуцёўкі, астатняе кампенсуе адміністрацыя і прафсаюз. Задаволеныя адпачынкам застаюцца як дарослыя, так і іх выхаванцы.

А яшчэ работнікі ЛЭМТа, можна сказаць, сапраўдныя эстэты, адданыя мастацтву. Калі ў сталічных музеях ладзіцца нешта цікавае, прафсаюз кідае кліч і ўсе дружна ідуць на выстаўку.

Вось так адпачынак дапамагае лепш працаваць, а плённая праца — змястоўна адпачываць.



Работнікі прадпрыемства ўдзельнічаюць у конкурсе будаўніцтва моста.

***Наталля Курцэвіч, мантажніца радыёэлектроннай апаратуры:***

*— Я тут працую другі год, мяне ўсё задавальняе: цікавая работа, дастойныя заробкі, калектыў, дырэктар, кіраўніцтва. Я проста ў захапленні ад нашых людзей. Прафсаюз для нас шмат робіць, арганізуе паездкі па краіне, за мяжу, дапамагае шматдзетным сем'ям, ладзіць для нас святы, розныя мерапрыемствы.*

***Міхаіл Туравец, рэгуліроўшчык пятага разраду:***

*— У свой час я прайшоў завод «Інтэграл», розныя фірмы. І мне ёсць з чым параўноўваць наша прадпрыемства. Яго ўзровень дастаткова высокі, вышэйшы за сярэднія заходнія ўзоры. На маю думку, не так і многа ў нас прадпрыемстваў, якія маюць добрых кіраўнікоў. І дастойных людзей, якія стараюцца нешта рабіць, нават калі ёсць нейкае супрацьдзеянне. Гэта дарагога каштуе.*

***Таццяна Шарко, слесар механазборачных работ:***

*— Працую на заводзе амаль 38 гадоў, а ў ЛЭМТ — 22 гады. Мяне задавальняе ўсё: калектыў, стабільная зарплата. У нас апошнім часам набралі шмат маладых спецыялістаў. Нягледзячы на тое, што я старэйшая за іх, з імі лёгка і прыемна працаваць.*

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і з архіва прадпрыемства.** УНП 100230590.

■ Вечныя каштоўнасці

# ГОРАД ПАД ЗЯЛЁНЫМ АБАЖУРАМ

**Звычнымі ў нашым жыцці сталі буйныя вытворчыя аб'яднанні ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Але ў сталіцы амаль 40 гадоў працуе і самы сапраўдны «культурны холдынг» — цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк Мінска. Пра тое, якія ўнікальныя задачы яна вырашае, карэспандэнт "Звязды" пагутарыў з дырэктарам Аленай КУБЫШКІНАЙ.**



**— Не баліць галава толькі ў дзятла, а ў дырэктара...**

— Мая баліць у першую чаргу аб тым, наколькі бібліятэкі сталіцы адпавядаюць патрабаванням часу, за пазітыўны імідж нашых устаноў, іх тэхнічную аснашчанасць, за камплектаванне фондаў і тое, наколькі яны задавальняюць попыт чытачоў, карыстальнікаў бібліятэк.

**— А вы попыт вывучаеце?**

— Попыт мы вывучаем. Публічныя бібліятэкі заўсёды вывучаюць попыт, грунтуючыся на рэальнай практыцы сваіх стасункаў з чытачамі. Гэта і ёсць і вопыт, і попыт.

**— А калі з'явілася ваша даволі нязвыклае аб'яднанне?**

— Яшчэ з 1976 года ў вялікай краіне ажыццяўлялася цэнтралізацыя бібліятэк. Наша сістэма масавых бібліятэк Мінска была створана ў 1979 годзе. Лічу, што цэнтралізацыя — вартая справа. Па такім шляху пайшлі і замежныя бібліятэкі. Роднасныя нам цэнтралізаваныя бібліятэкі існуюць і ў развітых краінах.

**— Як адчувае сябе сістэма сёння, Алена Віктараўна? Яна развіваецца, набывае фонды, расце колькасць чытачоў?..**

— У наш лічбавы век тэндэнцыі самыя разнастайныя. Прынамсі, колькасць чытачоў у традыцыйным разуменні слова змяншаецца. Калі два дзесяцігоддзі таму ў грамадстве назіраўся сапраўдны бум патрэбы ў інфармацыі і ў чытальныя залы сталі чэргі, то сёння такой карціны вы не ўбачыце. Пікавыя нагрузкі ў задавальненні інфармацыйнага «голаду» ўзяў на сябе інтэрнэт. Іншая справа — наколькі кожны раз гэтая інфармацыя дакладная, мне сказаць складана. У адрозненне ад сусветнага павуціння, бібліятэкі даюць чалавеку, як правіла, дакладную, выверанную інфармацыю. І неабавязкова адфільтраваную, бо ніхто цяпер на адфільтраванасць не пагодзіцца.

**— Як вы лічыце, у змяншэнні прытоку чытачоў у бібліятэкі ці вінаваты... самі пісьменнікі?**

— Калі гаварыць пра мастацкую літаратуру, публіцыстыку, то быў час, калі літаратура фарміравала грамадскую думку. І пісьменнік для многіх з'яўляўся своеасаблівым «гуру». Гэта асабліва было заўважна ў эпоху перабудовы. Разам з яе завяршэннем, відаць, адпала вострая неабходнасць у тым, каб мастацкае слова непасрэдна ўплывала на грамадскія працэсы, грамадскія рухі. Добра было б, але чаго няма, таго няма. І галоўная прычына, на мой погляд, у тым, што ў наш побыт у вялікай ступені ўвайшоў інтэрнэт і, паўтаруся, узяў на сябе функцыі і інфарматара, і, калі хочаце, выхавальніка. Пра тое, які гэта інфарматар і тым больш які выхавальнік, — размова асобная, але ў друкаванага слова з'явіўся магутны канкурэнт, і мы не можам гэтага не ўлічваць. Так што ў кантэксце нашай размовы мы мусім гаварыць, што канкурэнтам інтэрнэт стаў і для публічных, і нават спецыялізаваных бібліятэк.

Сацыяльныя сеткі сёння, відаць, уплываюць на грамадства і на жыццё ў цэлым больш, чым літаратура. Пры гэтым не будзем змяншаць і яе ролю: сваё месца сярод людзей яна заняла даўно і трывала. Проста час такі.

Мая асабістая ўпэўненасць: беларуская літаратура — гэта літаратура дастаткова высокай якасці. Магчыма, ёй варта шукаць і знаходзіць тэмы, якія адпавядалі б духу нашага часу і больш краналі, знаходзілі водгук у душах — жанчыны і мужчыны, падлетка і нават дзіцяці.

**— А ці збіраеце вы іх разам — пісьменнікаў і чытачоў, каб яны пачулі і зразумелі адно аднаго?**

— Гэта пастаянная практыка бібліятэк. У прыватнасці, мы даўно сябруем з гарадской арганізацыяй Саюза пісьменнікаў Беларусі, і яе старшыня Міхась Паўлавіч Пазнякоў — сябра бібліятэк. Наша сумесная праца стала нефармальнай, насычанай, цікавай. Усяго адзін штрых: у Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы два гады паспяхова працуе Мінскі гарадскі тэатр паэзіі. Гэта якраз ідэя Міхася Паўлавіча, ён хацеў, каб такі тэатр быў. Аўтары рыхтуюцца, імкнуцца падаць сябе і свае творы ў нетрадыцыйным ключы. І сустрэчы сапраўды часта ператвараюцца ў маленькі цікавы спектакль. Асабліва стараецца літаратурная моладзь.

**— І ўсё ж, як развіваюцца бібліятэкі Мінска? Ці ўмацоўваецца іх матэрыяльная база?**

— Апошні раз мы адкрывалі новую бібліятэку ў мікраёне Брылевічы дзевяць гадоў таму, яе № 22. У 2013 годзе значна палепшыліся ўмовы для абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі № 12, якая з прыстасаванага памяшкання пераехала ў новы, спецыяльна ўзведзены будынак на вуліцу Аўрораўскую. Мы хацелі б, каб узвядзенне сучасных публічных бібліятэк у новых мікраёнах, у «спальніках» (нават не адкрыццё ў прыстасаваных памяшканнях) стала трывалай практыкай. І пабудаваны яны павінны быць паводле плана і архітэктурнага праекта, дзе ўсё будзе прадугледжана, у тым ліку і дастаткова ўмяшчальная зала для літаратурных сустрэч.

Славуты «МАПІД» за апошнія гады ўзвёў, па сутнасці, сапраўдны горад у горадзе — Каменную горку. Пабудаваны важныя сацыяльныя аб'екты. Лічым, настаў час і для сучаснай публічнай бібліятэкі.

Паколькі горад імкліва развіваецца, а новых бібліятэчных устаноў пакуль няма, то ўся нагрузка прыпадае на тую сетку, якая існуе. Гэта 25 дарослых і 18 дзіцячых бібліятэк. Праўда, дарослыя часта абслугоўваюць і дзяцей, асабліва калі гэта падлетак, і наадварот.

**— Існуе такі інтэграваны паказчык, як чытальнасць, раней ён складаў 18,6 працэнта...**

— Зараз 16, бліжэй да 15. Некаторае зніжэнне не гаворыць, што аматары чытання ўзялі і прапалі, некуды падзеліся. Яны чытаюць кнігі на электронных носьбітах.

**— Калі ласка, два словы пра камплектаванне фондаў.**

— У свой час праблему вывучалі на самым высокім узроўні, і з'явілася даручэнне прэзідэнта краіны аб умацаванні фондаў. Сёння камплектаванне ажыццяўляецца недзе ў памеры 12 працэнтаў ад агульнага аб'ёму сродкаў, што выдзяляюцца на ўтрыманне бібліятэк.

**— А агульны аб'ём сродкаў вырас?**

— Вырасла цана кнігі, вось у чым праблема. Вырасла цана друкаванага выдання, а таксама цана перыядычнага выдання. Перыёдыка стала надзвычай дарагая. У выніку ўсяго гэтага частка насельніцтва мае магчымасць атрымаць кнігу ці нават пачытаць свежую газету толькі ў бібліятэцы. Моладзь таксама часцей стала заглядваць да нас са спісам літаратуры, малады вяртаюцца ў бібліятэкі.Так што казаць пра непатрэбнасць бібліятэк заўчасна.

Наогул, не адно дзесяцігоддзе вакол бібліятэк назіраецца аб'яднанне людзей па інтарэсах. Галоўны смак ад такога аб'яднання — магчымасць пагаварыць, паказаць нешта сваё і на людзей паглядзець. У нас гэта і літаратурны гурток «ЛітЭра», і гурток аматараў лічбавай фатаграфіі з абавязковай дэманстрацыяй уласных здымкаў, нават з аматарскай выстаўкай, экспазіцыя якой пастаянна абнаўляецца. Гэта і гурткі рукадзелля, здаровага харчавання, абароны экалогіі... Рэалізуецца вострая патрэба ў жывых стасунках, яна стала адчувацца вельмі і вельмі.

**— Адна з задач, якія вы вырашаеце, — інфарматызацыя...**

— Мы вядзём электронны каталог, базу даных «Мінск — гісторыя і сучаснасць», фарміруем такія фактаграфічныя базы даных, як «Вуліцы Мінска», «Здаровы лад жыцця», «Спартыўныя пляцоўкі Мінска» і іншыя. У нас свой сайт, дзе ёсць і віртуальная кніжная выстаўка новых паступленняў. У сайта пяць-шэсць тысяч наведванняў у месяц.

Па той прычыне, што ў нас з'явіўся сур'ёзны канкурэнт, ад якога ніколі не пазбавішся, — інтэрнэт, складана сказаць, якім будзе лёс бібліятэк, у першую чаргу публічных. Гэта глабальная, агульначалавечая праблема. Якія б новыя формы работы бібліятэка ні знаходзіла, яны прымяняльныя толькі да сённяшняга жыцця, сённяшняга грамадства. І толькі час адкажа на ўсе пытанні, у тым ліку, ці патрэбна чалавецтву «бібліётэка» ў тым выглядзе, у якім яна існуе сёння.

**АД РЭДАКЦЫІ.** Запрашаем чытачоў да працягу размовы. Дасылайце свае пісьмы ў рэдакцыю і электронныя водгукі на адрас vladimir.hilk@tut.by, прачытаем іх уважліва.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ** ■



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**У Нацыянальнай бібліятэцы заўсёды сустрэнеш аматараў спрычыніцца да разумнага і вечнага.**

■ Фестывалім

# КНІЖНЫ СКАРБ БЕЛАРУСІ

**Падчас святкавання 890-годдзя горада ў Гродне адбыўся Другі фестываль кнігі**

**Выставачныя экспазіцыі, тэматычныя пляцоўкі, творчыя сустрэчы — усё гэта і многае іншае стала зместам кніжнага фестывалю, які сабраў таленавітых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, вядучыя выдавецтвы і друкарні краіны.**



Прэзентаваць свае літаратурныя навінкі і мець прамы кантакт з чытачамі змаглі прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда», выдавецтваў «Беларусь», «Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура».

— Мы імкнёмся да папулярызацыі кнігі, — падкрэсліў **дырэктар прадпрыемства «Гроднааблсаюздрук» Павел СКРАБКО**. — Асаблівую ўвагу ўдзяляем беларускім аўтарам і літаратуры для дзяцей і падлеткаў. Вельмі важна закласці фундамент, каб дзеці з ранняга ўзросту абапіраліся на друкаваную кнігу і адчувалі яе хараство. Бо ніякі электронны аналаг не заменіць «жывую» кнігу.

Інтарэс да кнігі ёсць. Аб гэтым сведчыць і рост продажу. Павел Скрабко паведаміў, што кніга мяняецца дзякуючы выдавецкай дзейнасці. Яна становіцца больш маляўнічай, асабліва дзіцячая літаратура. Новага ўзроўню дасягнула за апошнія гады і якасць паліграфіі, што робіць кнігу яшчэ больш запатрабаванай. На фестывалі былі прадстаўлены магчымасці і выдавецтваў, і друкарняў.

— Першы фестываль летась быў прысвечаны 500-годдзю айчыннага кнігадрукавання, а сёлета мы праводзім яго ў рамках свята горада. Гродну — 980 гадоў, і гэта тэма таксама знайшла адлюстраванне ў праграме свята, — расказала **намеснік дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага Марына ІГНАТОВІЧ**.

На галоўнай сцэне фестывалю паэты і празаікі абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі выступілі з літаратурна-музычнай кампазіцыяй, якую прысвяцілі любімаму гораду.

З дапамогай артыстаў Гродзенскага тэатра лялек «ажылі» вядомыя казкі Пушкіна, якія трывала ўвайшлі ў рэпертуар тэатра. Дарэчы, «лялечная» тэма была прадстаўлена ў выстаўцы самаробных лялек — герояў казак і іншых літаратурных твораў. У конкурсе прынялі ўдзел прадстаўнікі з усіх раёнаў Гродзеншчыны. Трэба сказаць, што першы фестываль летась сабраў удзельнікаў конкурсу на найлепшую саматробную кнігу.

Гэтым разам асобную экспазіцыю занялі факсімільныя выданні з фондаў абласной бібліятэкі. Некаторыя факты літаратурнага жыцця горада былі прадстаўлены на стэндах. Многія маглі даведацца, што праездам у Гродне пабывалі Лермантаў і Гоголь. Быў тут і Маякоўскі. Прыкметна, што фестываль кнігі адбыўся ў дзень бібліятэк, а першая бібліятэка была створана ў Гродне 188 гадоў таму. Зараз у вобласці іх больш за 300, з якіх 220 працуюць у сельскай мясцовасці. Раённыя бібліятэкі прадставілі экспазіцыі, прысвечаныя Году малой радзімы. Шмат цікавага прапанавалі інтэрактыўныя пляцоўкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ** ■

■ Таямніцы Зямлі

# НАРОДЖАНЫЯ Ў СТАРАЖЫТНАЙ МАГМЕ

**Усе ведаюць, што алмаз каштуе вялікіх грошай, амаль усе — што гэта самае цвёрдае прыроднае рэчыва. Вашай увазе некалькі фактаў пра ўтварэнне гэтага прыгожага і таямнічага мінералу.**

Алмазы ўтвараюцца ў зямной мантыі на глыбінях каля пары сотняў кіламетраў. Там велізарны ціск, і там вельмі горача. Калі алмаз нагрэць да такой тэмпературы на паверхні, то ён згарыць. Бо гэта абсалютна гэткі ж вуглярод, як і ў печы, проста атамы размешчаны па-іншаму. А ў зямной мантыі свабоднага кіслароду няма, вось алмазы і не згараюць.

Вуглярод, з якога складаюцца алмазы, быццам бы не павінен знаходзіцца на такіх глыбінях. Гэта лёгкі элемент, ён распаўсюджаны ў зямной кары, а глыбей залягае тое, што за мільярды гадоў пасля фарміравання планеты, паспела «патануць» у яе нетрах. Мабыць, справа ў субдукцыі — працэсе апускання аднаго блока зямной кары пад іншы. Акіянічная кара, якая складаецца ў асноўным з базальтаў, фарміруецца ў тоўшчы акіянаў, у зонах сярэдзінна-акіянічных хрыбтоў. Адтуль яна «рассоўваецца» ў супрацьлеглыя бакі. Край кары, які ўпіраецца ў мацярык, падгінаецца пад яго і паступова тоне ў мантыйным рэчыве. Разам з ападкавымі пародамі, у якіх шмат вугляроду. Гэты працэс ідзе з хуткасцю сантыметраў — у год, але бесперапынна.

Блакітныя алмазы вельмі цэняцца ювелірамі і іх пакупнікамі. Гэта амаль звычайны алмаз, афарбаваны невялікай прымессю бору. Бор яшчэ лягчэйшы за вуглярод, і яго наяўнасць на вялікіх глыбінях яшчэ менш верагодная. Як відаць, ён трапляе туды гэтак жа, але ў меншай колькасці. Фарміруюцца блакітныя алмазы на рэкорднай глыбіні — 600—700 кіламетраў. Таму на паверхні яны вельмі рэдкія — іх колькасць рэчывы па меры змены ціску пераходзяць з аднаго стану ў іншы. Скажам, стабільны пры шасці і больш гектапаскалях ціску сцісшавіт пры зніжэнні ціску ператвараецца ў каэсіт, а пры дасягненні паверхні — у добра знаёмы нам кварц. Яго хімічная формула пры гэтым, вядома, не змяняецца — гэта дыяксід крэмнію, $SiO_2$. Акрамя таго па ціску ва ўключэннях можна дакладна вызначыць глыбіню фарміравання алмаза.




складае каля 0,02 % сусветнай здабычы.

Пры крышталізацыі алмаза ўнутры яго часам аказваюцца рэчывы, якія акружалі яго ў гэты момант. Гэта бяда для ювеліра і шчасце для геолага. Справа ў тым, што крышталічная рашотка алмаза з-за сваёй трываласці можа ўтрымаць захопленыя мінералы пры тым жа ціску, пры якім яны знаходзіліся ў момант фарміравання самога «каменьчыка». А гэта істотна, паколькі шматлікія а прыкладна ў кожнай дзясятай. Як мяркуюць геолагі, на долю кімберліту прыпадае каля 90 % сусветных запасаў алмазаў. Астатнія 10 % прымеркаваны да лампраітаў. Гэта таксама вывергнутыя пароды, якія характарызуюцца высокім утрыманнем калію і магнію.

Да адкрыцця кімберлітавых трубак алмазы здабываліся ў россыпах, пераважна рачных. Як цяпер зразумела, яны ўтварыліся пры эрозіі

На паверхні алмазы трапляюць з кімберлітам — старажытнай магмай, якая калісьці прарвалася на паверхню праз кімберлітавую трубку — адносна вузкае жарало, якое злёгку пашыраецца ўгору. Назвай трубка і мінерал абавязаныя паўднёваафрыканскаму гораду Кімберлі, каля якога ў XIX стагоддзі была адкрыта першая такая трубка. Цяпер па ўсім свеце іх вядома прыкладна 1500. На жаль, алмазы ёсць далёка не ва ўсіх, кімберлітавых вулканаў, ад якіх да нашых дзён засталіся толькі трубкі. Россыпаў, якія маюць прамысловае значэнне, у свеце было няшмат. Бразільскі быў практычна вычарпаны да канца XVIII стагоддзя, індыйскі — на пару стагоддзяў раней. Россыпы ў Паўднёвай Афрыцы былі знойдзены ў XIX стагоддзі, і менавіта іх распрацоўка каля Кімберлі ў канчатковым выніку прывяла да знаходкі першай трубкі ■

■ Паўтараць не рэкамендуецца

## Самы небяспечны рэкорд

**Канал RealLifeLore расказаў аб самым небяспечным спосабе ўстанавіць сусветны рэкорд і таксама пра тое, як шмат выдатных асоб загінулі, стаўшы ахвярай сваіх памкненняў.**

Сярод усіх рэкордаў свету рэкорд хуткасці — мабыць, адзін з самых складаных. Ён патрабуе неверагоднай канцэнтрацыі і сапраўднага майстэрства ад усіх, няхай гэта будзе пілот самалёта ці капітан судна. Самая малая памылка можа каштаваць авантурысту жыцця, паколькі нават сустрэча з вадой на хуткасці ў некалькі сотняў кіламетраў у гадзіну можа з лёгкасцю стаць смяротнай.

З 1930 года рэкорд хуткасці на вадзе стаў забіраць чалавечыя жыцці. Сэр Генры Сігрэйв у ролі пілота, а таксама механік Майкл Уолкакс і інжынер Віктар Холіўэл пацярпелі падчас свайго трэцяга заплыву на вострагве Уіндэрмер у Вялікабрытаніі. За рэкордную хуткасць 158,94 км/г каманда заплаціла дарагую цану: лодка пацярпела крушэнне, што каштавала жыцця Сігрэйву і Холіўэлу.

З 1950-х гадоў, калі энтузіясты пачалі ўсталёўваць на лёгкія судны рэактыўныя рухавікі, смяротнасць сярод рэкардсменаў пачала імкліва павялічвацца. Так, у 1952 годзе Джон Коб устанавіў на возеры Лох-Нес рэкорд хуткасці 337 км/г, аднак лёгкі нахіл насавой часткі ў секунду раскідаў абломкі судна па возеры, а сам Коб памёр ад болевага шоку і траўмаў, атрыманых падчас сутыкнення з вадой.

Апошняя буйная катастрофа адбылася ў 1989 годзе, калі Крэйг Арфонс разагнаў сваю лодку да 483 км/г і не змог справіцца з кіраваннем, паплаціўшыся за гэта жыццём. Да гэтага часу сярод аматараў і прафесіяналаў ідзе адчайная барацьба за ўсё новыя рэкорды, і, хоць амаль за стагоддзе тэхналогіі ступілі далёка наперад, гэты занятак усё яшчэ застаецца адной з самых небяспечных забаў на Зямлі ■



## «КЭНАН» РАЗВІТАЎСЯ З ПЛЁНКАЙ

**Японская кампанія Canon спыніла рэалізацыю сваёй апошняй плёнкавай фотакамеры EOS-1V. Пра гэта паведамляе выданне Sankei.**

Афіцыйна вытворчасць дадзенай мадэлі была спынена ў 2010 годзе, з тых часоў кампанія распрадавала прадукцыю са складоў. Нягледзячы на канфіскацыю мадэлі з асартыменту, Canon працягне сэрвіснае абслугоўванне такіх камер да 31 кастрычніка 2025 года. Пры гэтым у рамонце можа быць адмоўлена ўжо ў 2020 годзе, калі скончацца вырабле용ныя запчасткі.

Першая лічбавая камера Canon RC-701 была прадстаўленая публіцы ў 1984 годзе, і з тых часоў кампанія пачала канцэнтравацца менавіта на гэтым напрамку. Галоўны канкурэнт Canon кампанія Nikon па-ранейшаму прапануе пакупнікам дзве плёнкавыя мадэлі камер Nikon F6 і Nikon FM10. Canon была створана ў 1937 годзе пад назвай Precision Optical Instruments. Першай яе мадэллю быў клон нямецкай Leica — The Kwanon. У той час кампанія яшчэ не займалася аб'ектывамі, таму яна выкарыстала оптыку Nikkor ад Nippon Kogaku K.K., з якой з'явіўся Nikon.

■ Дайджэст



## Новабудоўлі Дубая будуць на 25 % надрукаваныя

**Улады эмірата Дубай, якія ўваходзіць у ААЭ, прынялі нарматыў, які абавязвае забудоўшчыкаў да 2025 года выкарыстоўваць пры ўзвядзенні новабудоўляў дэталі, раздрукаваныя на трохмерным прынтары. Такіх кампанентаў павінна быць не менш за 25 % ад цэлага будынка. Праўда, пакуль незразумела, ідзе гаворка пра чвэрць ад аб'ёму ці масы.**

Пачынаючы з 2019 года ўсе зноў пабудаваныя ў Дубаі будынкі павінны не менш, чым на 2 %, складацца з раздрукаваных канструкцый. Затым кожны год доля раздрукаваных дэталяў павінна нарастаць. Дасягненне мэты можа прывесці да скарачэння выдаткаў на будаўніцтва на 70 %, а выдаткаў на працоўныя рэсурсы — на 80 %.

Тым не менш важна памятаць: нягледзячы на тое што трохмерны друк у сучасным свеце распаўсюджваецца ўсё больш, ён па-ранейшаму з'яўляецца новай тэхналогіяй, якая не тэсціравалася на значнай колькасці буйных структур. Гэта можа пацягнуць за сабой непрадбачаныя выдаткі. На цяперашні момант дубайская кампанія Cazza Technologies плануе ўзвядзенне цалкам 3D-друкаванага хмарачоса ў горадзе. Работы пачнуцца ў 2023 годзе. Крыс Келса, генеральны дырэктар кампаніі, мяркуе, што выкарыстаныя яго кампаніяй метады да 2022 года змогуць заняць да 30 % на мясцовым рынку. Першы будынак, цалкам надрукаваны на 3D-прынтары, — офісны цэнтр «Офіс будучыні» — быў пабудаваны ў Дубаі ў 2016 годзе, прычым яго ўзвядзенне заняло ўсяго 17 дзён.



## Касмічнае смецце будуць лавіць «скруткі»

**Праблема касмічнага смецця на арбіце Зямлі з кожным годам становіцца ўсё больш сур'ёзнай. Цяпер, па падліках спецыялістаў, на калязямной арбіце «лётае» каля 7700 тон смецця, і гэтая лічба працягвае расці.**

Для таго каб неяк вырашыць гэтую праблему, амерыканскае аэракасмічнае агенцтва NASA запусціла праграму Innovative Advanced Concepts (NIAC), якая закліканая спансіраваць перспектыўныя напрацоўкі ў гэтай галіне. Адна з такіх вынаходак — Brane Craft. Гэта мембрана памерам 90х90 сантыметраў і вагой у 85 грамаў, праце яна на гнуткіх сонечных батарэях. Прынцып работы прылады досыць просты: з дапамогай рухальнай устаноўкі апарат падлятае да касмічнага смецця, а затым «заварочвае» гэтае самае смецце. Пасля гэтага такі «кулёк» пачынае рухацца ў бок Зямлі і апускае касмічныя адходы ў шчыльныя слаі атмасферы, дзе яны і згараюць. Завяршыўшы працэдуру, Brane Craft перамяшчаецца да наступнай «смеццевай навалы». Сонечныя батарэі і ёмістыя рухавікі даюць магчымасць касмічнаму смеццезборшчыку перамяшчацца на вялікія адлегласці, а гэта значыць, што апарат можна выкарыстоўваць для правядзення даследчых місій і дастаўкі касмічных узораў.

За распрацоўку адказвае доктар Зігфрыд Янсан, які яшчэ ў 2016 годзе атрымаў ад NASA грант у памеры 100 000 доляраў для прапрацоўкі канцэпта, а нядаўна навукоўцы выдзелілі дадатковыя субсідыі ў выглядзе 500 000 на стварэнне выпытнага ўзору і выпрабаванняў ■

**Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

# КОНІ, ЛАСІ, ПЧОЛЫ І МЁД...

■ Ёсць патэнцыял

## ЗАБАРОНЕНАЯ ЗОНА СТАНЕ ДАСТУПНАЙ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ?

**У сярэдзіне верасня ў Хойніках — плюс 25—27 градусаў, гэта норма. Вее сухі ветрык. Мне, жыхару сталіцы, ён здаецца гарачым. Яшчэ 20—25 хвілін на камфартабельным аўтобусе, і мы пад'язджаем да Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Ахова, калючы дрот, шлагбаум... На тэрыторыі запаведніка цікаўлюся фонам навакольнай радыяцыі. Першы намеснік дырэктара гэтай закрытай зоны Генадзь Гапоненка па-ваеннаму коратка адказвае: 0,46 мікразіверта ў гадзіну. Бяспечным лічыцца ўзровень радыяцыі да велічыні, прыблізна 0,5 мікразіверта ў гадзіну (да 50 мікрарэнтген у гадзіну). Значыць, знаходзіцца тут можна без праблем. Але турыстаў пакуль сюды не пускаюць. Праўда, хутка сітуацыя зменіцца.**

— Задачу па развіцці турызму ў гэтым рэгіёне нам паставіў кіраўнік дзяржавы падчас наведвання Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, — паведаміў **намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС МНС Пётр НІКАЛАЕНКА.** — Многія турыстычныя кампаніі звярталіся да нас з просьбай аб магчымасцях наведвання запаведніка ў турыстычных мэтах. Але, згодна з існуючым заканадаўствам, гэта катэгарычна забаронена. Каб вырашыць гэта пытанне (і шмат спадарожных аб развіцці іншых відаў дзейнасці запаведніка) мы ўнеслі прапановы ў праект новага ўказа. Ён ужо падрыхтаваны, узгоднены з усімі зацікаўленымі ведамствамі і накіраваны на падпісанне кіраўніку дзяржавы. Мы спадзяёмся, што па новым дакуменце будзем працаваць ужо з пачатку наступнага года. Праўда, пасля падпісання Указа трэба будзе прыняць яшчэ закон, які рэгулюе наведванне тэрыторыі запаведніка.

**— Як можна будзе тады трапіць на тэрыторыю запаведніка?**

— Прадугледжваецца два шляхі: наўпрост — праз арганізацыю наведвання зоны непасрэдна адміністрацыяй запаведніка, а таксама пры дапамозе прыцягнення для гэтых мэт турыстычных фірмаў.

**— Гэта будзе экстрэмальны турызм?**

— Ніякай нават патэнцыйнай небяспекі пры наведванні запаведніка не будзе. Будуць адпрацаваны такія схемы маршрутаў, якія пралягаюць па тэрыторыі запаведніка з найменшым узроўнем забруджвання, які ні ў якай меры не пагражае здароўю людзей. Напрыклад, мы сёння знаходзімся ў эксперыментальна-гаспадарчай зоне запаведніка. Тут узровень забруджвання (фон) невысокі. На плошчах гэтай зоны цалкам прывольна пасуцца табуны коней, тут устаноўлены нашы пчальнікі. Мёд, атрыманы тут, правяраецца на спецыяльным абсталяванні. Жорстка правяраецца. Пчолы і мёд, які можна ўжываць, — гэта паказчык бяспекі тэрыторыі. Вядома, пры пэўных абмежаваннях.

**— Які гэта будзе турызм: пешы, спартыўны, можа быць на конях, спецыяльных машынах?**

— Будуць разглядацца розныя варыянты. З часам яны будуць мяняцца ў залежнасці ад попыту. Але, яшчэ раз падкрэслю: тут турызм ніколі не стане экстрэмальным, бо здароўе людзей для нас застаецца галоўным прыярытэтам. Таму асноўныя маршруты будуць пралягаць па асфальтаванай дарозе, дзе менш пылу, дзе яго лягчэй за ўсё змыць. Такая дарога ў нас пракладзеная да самай Прыпяці, дзе была пераправа на тэрыторыю Украіны.

**— На Украіне маршруты такога турызму пралягаюць непасрэдна цераз горад-прывід, тое месца, дзе выбухнуў атамны рэактар. Пусты горад з шматпавярховымі дамамі, мёртвы горад...**



— У нас такога эмацыянальнага аб'екта няма. На Украіне гэта хутчэй за ўсё і будзе экстрэмальным турызмам, амаль забароненая забаўка. У нас кірунак трошкі іншы — паказаць, як прырода развіваецца ў такой мясцовасці без чалавека. Тут у вялікай канцэнтрацыі знаходзяцца амаль усе чырвонакніжнікі краіны. У запаведнік хочуць трапіць усе тыя, хто ўсур'ёз захапляецца сусветнай фаўнай. Для іх наш запаведнік казачнае месца, бо тут вельмі шмат птушак жыве па сваіх спецыяльных законах, якія выключаюць сутыкненне з чалавекам. Вы ведаеце, нават буслы ў дзікай прыродзе паводзяць сябе зусім па-іншаму, яны ў запаведніку вельмі баяцца людзей... Сюды людзі будуць прыязджаць спецыяльна, каб фатаграфаваць жывёл. Тут па закінутых вёсках ходзяць ласі, а за дзікамі палююць велізарныя ваўкі. І ўсё гэта, калі пашанцуе, можна ўбачыць на свае вочы.

**— Магчыма, з часам дазволяць не толькі фотапаляванне, але і сапраўднае?**

— Усё магчыма. Але вы разумееце, што гэта будзе паляванне без трафеяў. Так, фатаграфія забітага звера — не больш за тое. Таму што мяса дзіка, здабытага тут, будзе «фаніць», як і рогі аленя альбо лася — закрытая зона ўсё ж... Але давайце не будзем паперадзе воза ісці. Спачатку трэба каб быў прыняты новы дакумент аб развіцці радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, а потым будзем будаваць планы.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Жыровічы: пах воску і хлеба

## Як старажытная святыня сустракае паломнікаў і турыстаў напярэдадні свайго 500-годдзя

**Нядаўна мне давялося пабываць з групай гродзенскіх паломнікаў у Жыровіцкім Свята-Успенскім манастыры. Паездка была арганізавана ў дзень памяці беларускага святога Серафіма Жыровіцкага. Зранку поўны аўтобус выехаў з Гродна ў напрамку аднаго з самых знакамітых манастырскіх комплексаў краіны, цераз які пралягае не адзін турыстычны маршрут.**



### З духоўным ухілам

Жыровіцкі манастыр нагадвае дзяржаву ў дзяржаве. Тут свой нетаропкі ўклад. Галоўнае месца займаюць храмы — іх на тэрыторыі манастыра чатыры. Галоўны — Свята-Успенскі сабор са званіцай. Гэта, можна сказаць, сэрца манастыра — тут захоўваецца тая самая цудадзейная ікона Маці Божай Жыровіцкай, якая двойчы з'яўлялася ў гэтых мясцінах. Апошні раз — 500 гадоў таму. Кожны наведвальнік храма абавязкова падыходзіць да яе і запальвае свечку.

Дарэчы, на месцы з'яўлення іконы пабудавана царква, якая так і называецца — Яўленская. Захаваўся і той старажытны камень, на якім з'явілася перад дзецьмі Багародзіца, — ён устаноўлены ў алтары. Па сутнасці з таго часу пачынаецца і гісторыя манастыра, які ў 2020 годзе адзначыць 500-гадовы юбілей. Між іншым, ужо сфарміраваны аргкамітэт падрыхтоўкі свята, які ўзначаліў Патрыяршы Экзарх Павел.

Трэба сказаць, што да гэтай даты Жыровіцкі манастыр падыходзіць аднаўлены. Але будаўнічыя работы тут цягнуліся амаль 30 гадоў. Напачатку гэта быў толькі рамонт, але з часам ён перарос у трывалую рэканструкцыю з турыстычным ухілам. Дарэчы, экскурсіі тут арганізоўца кожную гадзіну з 9 да 16.

Значна аднаўленым выглядае будынак Мінскай духоўнай семінарыі. Студэнтаў-семінарыстаў у рызах можна сустрэць і на тэрыторыі манастыра. У іх ёсць свой інтэрнат, так званы брацкі корпус, — цагляны трохпавярховы будынак, таксама з рамонтам. Але яго жыццё схавана ад чужых вачэй. Закрытай з'яўляецца і сама семінарыя.

### Хлеб наш надзённы...

А ўсяго Жыровіцкі комплекс налічвае каля двух дзясяткаў аб'ектаў. Многія маюць бытавое прызначэнне. Напрыклад, дамы для паломнікаў і турыстаў. Дарэчы, ім не прыйдзецца клапаціцца аб ежы, бо літаральна ў цэнтры, недалёка ад увахода, месціцца трапезная. Тут прапануюць печыва, салаты, паўнавартасныя абеды, праўда без мясного. Напрыклад, у дзень нашага прыезду паломнікаў частавалі капустай на рыбным булёне і пловам з гароднінай. Быў таксама кампот са свежай ватрушкай.

Вялікі выбар прапануюць царкоўныя лаўкі: іконы, духоўная літаратура. Але ёсць тут і мёд з уласных пасек, і зборы траваў мясцовых паслушніц, і мазі-крэмы ад розных хвароб. Усё гэта варта ўжываць з малітвай.

Усе пабудовы вельмі арганічныя і ствараюць адзіны архітэктурны ансамбль. І гэта прытым, што шэраг аб'ектаў будаваліся нядаўна. Татальная рэканструкцыя значна палепшыла быт манаскай абшчыны. Увайшлі ў строй карпусы, прызначаныя для прыёму і абслугоўвання турыстаў, некалькі трапезных і іншыя гаспадарчыя аб'екты. Стварацца ўмовы для прыжывання шматдзённых турыстаў і паломнікаў. Усё гэта стала магчымым, дзякуючы прынятай некалькі гадоў таму дзяржаўнай праграме развіцця турызму, у якую ўвайшоў і Жыровіцкі манастыр. Цяпер Жыровічы — не толькі манастырскае падвор'е, але і аб'ект турызму ў Беларусі. Ён — унікальны і як помнік архітэктуры XVII—XVIII стагоддзяў, дзе сышліся класіцызм, барока і ракако.

### Беларускія святы

У той дзень — 6 верасня — у манастыры аддавалі даніну памяці беларускаму святому Серафіму Жыровіцкаму. Святочны малебен адслужыў Гурый, архіепіскап Навагрудскі і Лідскі. Літургію суправаджаў мужчынскі хор семінарыстаў.

Святы Серафім — асоба, якая тут вельмі шануецца. Менавіта ў Жыровічах у пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя ён прыняў манаскі сан. І ў першы год вайны пакінуў манастыр, каб падымаць разбураныя прыходы. Актыўную работу ён вёў у раёне Мінска, а ў сталіцы нават адкрыў царкву. Місіянерства прывяло яго ў 1944 годзе ў Гродна. Але тут яго арыштавалі і абвінавацілі ў шпіёнскай дзейнасці супраць савецкай улады. Толькі праз год быў вынесены абвінаваўчы прыгавор, згодна з якім яго на пяць гадоў выслалі ў лагер. Як сведчаць відавочцы, Серафіма чакаў там вельмі жудасны скон. У 1999 годзе ён быў кананізаваны і прылічаны да 23 новых мучанікаў. Памяць аб духоўным падзвіжніку ўшанавалі і паломнікі, якія прыбылі з розных куткоў Беларусі.

### «Жывая» вадзіца

Дарэчы, паломнікі, якія прыбываюць у манастыр на некалькі дзён, таксама нясуць пасільны послух. Гэта можа быць дапамога на кухні, праполка агарода, збор ягад, дагляд жывёлы. У манастыра вялікая гаспадарка. Ёсць нават свой вадаём, дзе вырошчваюць рыбу. Палі засяваюць збожжавымі культурамі, бульбай, агароднінай. Ёсць свае птушкаферма, свінакомплекс, пародзістыя коні. Плануюць нават арганізаваць для турыстаў верхавыя шпацыры.

Не так даўно манастыру быў перададзены стары сад, яго расчысцілі, арганізавалі сапраўдны заасад. Сюды часта прыводзяць дзяцей, дзе яны могуць убачыць лісу, мядзведзя, страуса, ланяў і іншых жывёл.

Наўрад ці хто-небудзь з турыстаў і паломнікаў абміне і святыя крыніцы. У Жыровічах іх тры. Адна адкрыта толькі для святароў і манахаў, бо знаходзіцца за алтаром Яўленскай царквы. Кажуць, што гэта тая крыніца, якая прабілася з-пад каранёў ігрушы, на якой з'явілася цудадзейная ікона.

Яшчэ адна крыніца знаходзіцца пад высокімі ценістымі дрэвамі. Гэта вельмі старажытны ручай, якому гадоў 200. У народзе яго называюць Дальні і трапіць да яго можна па цэнтральнай вуліцы пасёлка. Па ваду трэба спусціцца з пагорка, дзе стаіць нейкая асаблівая цішыня. Тут абсталявана купальня, але яна адна, таму часта бывае чэргі. Вось і наш аўтобус накіраваўся да іншай крыніцы — Бліжняй, якая была асвячона ў 2006 годзе. Чаргі амаль няма — на тэрыторыі крыніцы дзве купальні. Праўда, вада тут даволі халодная, але не пранізвае наскрозь, а нібыта агортвае цяплом. Ды і надвор'е гэтаму спрые. Кажуць, што трэба пабываць на абедзвюх крыніцах, каб выбраць «сваю». Некаторыя з нашай групы засталіся на дальняй, старажытнай, хоць там і была чарга.

І ўсё ж, каб адчуць спакой і адпачыць душой, трэба ехаць сюды на некалькі дзён. Месца ў манастырскай гасцініцы можна забраніраваць у Паломніцкім цэнтры. А за час знаходжання дапамагчы пасільнай працай. Дарэчы, пры манастыры працуе рэабілітацыйны цэнтр «Анастасіс», у якім дапамагаюць справіцца з алкагольнай і наркатычнай залежнасцю.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**





# «ГЭТА НЕ Я, А ГЛІНА МЯНЕ ВЫБРАЛА»





Пра тое, што ў Краснапольскім раёне з'явілася ганчарная майстэрня, напэўна, я даведалася самая апошняя. Трапіўшы сюды аднойчы, ты ўжо не забудзеш людзей, што тут працуюць, і сам пачнеш спрабаваць майстраваць нешта на ганчарным крузе.

Аляксандра ЧАРТКОВА прыехала ў Беларусь у 2010 годзе. Яна нарадзілася ў расійскім горадзе Сергіеў Пасад. Там пазнаёмілася са сваім будучым мужам, калі ён прыязджаў на работу. Пасля вяселля прынялі рашэнне пераехаць з вялікага падмаскоўнага горада ў беларускую вёску, адкуль родам муж.

Набылі дом. Нарадзілі дзяцей. У дэкрэтным адпачынку Аляксандра зразумела, што жадае навучыцца працаваць за ткацкім станком: дома знайшліся кросны, якія яна хацела аднавіць. Такім чынам Аляксандра трапіла ў Краснапольскі Дом рамёстваў. І там захапілася ганчарнай справай.

— Так, напэўна, павінны былі скласціся зоркі на небе, каб я тут апынулася. Пра ганчарную майстэрню ў раёне гаварылі ўжо даўно. І так супала, што мы разам з раённым гісторыка-этнаграфічным музеем паўдзельнічалі са сваёй творчай ініцыятывай у конкурсе праектаў. Зараз наша майстэрня існуе дзякуючы Праграме развіцця ААН (ПРААН), — распавядае жанчына.

У Аляксандры двое малых дзяцей. Штодзень пасля майстэрні яна шчыруе па хатняй гаспадарцы. Да ганчарнага круга захаплялася лапікавым шыццём, тэкстыльнай лялькай, пап'е-машэ. На пытанне, чаму выбрала кераміку, адказвае з усмешкай: «Гэта не я, а гліна мяне выбрала».

— Мару пра ўласную майстэрню, паездку ў Прыбалтыку, а яшчэ хачу навучыцца ездзіць конна, — здзіўляе сваімі планамі Аляксандра.

У творчых людзей мары заўсёды здзяйсняюцца.

**Таццяна ТКАЧОВА. Фота аўтара.**

*г. п. Краснаполле.*



*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

## Здарэнні

# МАХЛЯРСТВА НА ІГРАЛЬНЫМ БІЗНЕСЕ

### Завершана расследаванне крымінальнай справы пра несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі і крадзяжы грашовых сродкаў ігральных устаноў

У канцы 2016 года на тэрыторыі Беларусі і Расіі была створана арганізаваная група, у склад якой уваходзілі грамадзяне дзвюх краін, пры гэтым кіраўніцтва ажыццяўлялася з тэрыторыі Расіі. Удзельнікі групы падшуквалі адміністратараў залаў гульнявых аўтаматаў у Мінску, якія за матэрыяльнае ўзнагароджанне ўкаранялі ў USB-раздымы пэўных аўтаматаў прыстасаванні, якія нагадваюць назапашвальнік інфармацыі. Затым работнікі ўстаноў праводзілі перазагрузку абсталявання, у выніку чаго змяняўся алгарытм яго работы.

Затым ашуканцы пад выглядам гульцоў наведвалі гэтыя ўстановы. Пры сабе яны мелі тэхнічныя сродкі, з дапамогай якіх транслявалі адлюстраванні экрана аўтаматаў іншым удзельнікам арганізаванай групы. Апошнія апрацоўвалі даныя і паведамлялі гульцам камбінацыі клавіш, якія неабходна націснуць для пачатку бонуснай гульні. Па інфармацыі УСК па горадзе Мінску, кожны з гульцоў і адміністратараў залаў, задзейнічаных у схеме, атрымліваў 5-10 працэнтаў выйгрышу, астатняя сума перадавалася арганізатарам — грамадзянам Расіі. Супрацьпраўную дзейнасць спынілі супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС. Падчас расследавання ўстаноўлена больш за 40 злачынных эпізодаў. Маёмасная шкода склала не менш за Br222,4 тысячы.

Дзеянні 11 абвінавачаных кваліфікаваныя следчымі як несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі і махлярства, учыненае ў складзе арганізаванай групы. Крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд.

# «АДДЗЯЧЫЎ» ЗА НАЧЛЕГ

### Жыхар Севастопаля скраў грошы і маёмасць

**У Цэнтральны РУУС сталіцы звярнулася грамадзянка з просьбай прыцягнуць да адказнасці невядомую асобу, якая напярэдадні з кватэры заяўніцы скрала 800 долараў, планшэт і фотаапарат.**

Міліцыянеры ўстанавілі, што ў той дзень па просьбе сваёй знаёмай пацярпелая аказала садзейнічанне ў размяшчэнні на ноч у сваім жыллі мужчыны, якому не было дзе спыніцца. А ранкам гаспадыня кватэры і выявіла знікненне грошай і маёмасці.

Праваахоўнікі затрымалі падазраванага ў Гомелі. Гэта быў 36-гадовы жыхар Севастопаля. Заведзена крымінальная справа за крадзеж. Мужчына, па інфармацыі Цэнтральнага РУУС г. Мінска, можа атрымаць пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ або штрафу, ці папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, ці арышту, ці абмежавання волі на тэрмін да трох гадоў, ці пазбаўлення волі на той жа тэрмін. Затрыманы змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## А не шкодзь!

# НАЛАВІЎ НА КРЫМІНАЛЬНУЮ СПРАВУ

### Мужчына з Вілейскага раёна падазраецца ў незаконным рыбалоўстве

**Ён быў затрыманы работнікамі Мядзельскай міжрайінспекцыі на беразе вадасховішча каля вёскі Несцеркі.**

Мужчына перацягваў мяшкі з уловам. На рыбе меліся сляды ад сетак. Амаль уся рыба ў 84-кілаграмовым улове была каштоўных відаў: 37 асобін судака, 29 ляшчоў, чатыры шчупакі, шэсць акунёў, па тры асобіны карася і краснапёркі. Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, нанесеная прыродзе шкода ацэньваецца ў суму больш за 8 тысяч рублёў. Па факце незаконнага рыбалоўства Вілейскі РАСК пачаў крымінальную справу.

У 2016 годзе затрыманы ўжо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за здабычу рыбы сеткамі. Тады яму прызначылі буйны штраф — каля 20 мільёнаў недэнамінаваных рублёў. Зараз рыбака-нелегала чакае яшчэ больш строгае пакаранне.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности

**Организатор аукциона:** комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, конт. тел.: (017) 200 20 89, (017) 289 11 27, (017) 200 16 18.

Аукцион состоится **24 октября 2018 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**На аукцион выставляется:**

| | |
|---|---|
| Сведения о предмете аукциона | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D – 703568, общая площадь – 12,4 кв. м;<br>назначение – вспомогательное помещение жилого дома;<br>изолированное помещение расположено на первом этаже жилого дома, имеется электроснабжение, канализация, отопление, водопровод;<br>материал стен – ж/б панели;<br>помещение не оборудовано отдельным входом с придомовой территории;<br>год постройки жилого дома – 1991 |
| Место нахождения предмета аукциона | г. Минск, ул. Рафиева, 78-1Н |
| Начальная цена продажи предмета аукциона | 4362,89 рубля |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного банковского счета | 870 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13-AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, назначение платежа – задаток для участия в аукционе |
| Продавец предмета аукциона | Республиканское унитарное предприятие электросвязи «Белтелеком» г. Минск, ул. Энгельса, 6, тел. (017) 361 30 83.<br>Осмотр изолированного помещения потенциальными покупателями производится с участием представителя продавца – Дворкина Игоря Владимировича, конт. тел. (033) 603 38 36; (017) 361 30 83 |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 22 октября 2018 г. до 16.00.**

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона на указываемый в протоколе текущий (расчетный) банковский счет в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона, но не позднее десяти рабочих дней с даты проведения аукциона, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

